Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
פּראָלעטאַריער פון אַלע לענדער, פאַרייניקט זיך!
Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

15-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК і СНК БССР
XIII ГОД ВЫДАНЬНЯ
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА

ЧАЦЬВЕР
18 лютага 1932 г.
№ 39 (3428)

СЕНЬНЯ У НУМАРЫ:

Прамова тав. ГІКАЛО на сходзе менскага партактыву (1-ая стар.).
ПАСТАНОВА XIV ЗЬЕЗДУ КП(б)Б па дакладу ЦКК-РСІ БССР (3 ст.).
Змагацца за кожнае нілё лёнавалакна (2-ая стар.).
Заняць перадавое месца ў лесавывазцы (3-ая стар.).
Ударныя брыгады—кожнаму вучастку фінпляну.
ЗА МЯЖОЮ: Кварталы Шанхаю пад градам снарадаў (2-ая стар.).
ПА СССР: (2-ая стар.).
ПА БССР. (4-ая стар.).

Вынікі XVII Усесаюзнай партканфэрэнцыі і XIV зьезду КП(б)Б

Даклад сакратара ЦК КП(б)Б тав. ГІКАЛО на сходзе менскага партактыву 9 лютага 1932 г.

Таварышы, абстаноўка, у якой працавалі XVII усесаюзная партыйная канфэрэнцыя й XIV зьезд камуністычнай партыі Беларусі кожнаму з вас зядома. За гэты час да пачатку 1932 году партыя, пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК і правадыра партыі тав. Сталіна, упэўнена рушыцца ўперад і на справе давяла магчымасьць набудаваньня сацыялізму ў адной краіне.

Таварышы, ясная справа, што гэтыя дырэктывы пасіўны былі выклікаць выключную ўвагу, выключную цікавасьць, ня толькі кожнага ў пасобку члена партыі, але кожнага рабочага кожнага калгасьніка. Гэтыя дырэктывы прыкавалі да сябе ўвагу ня толькі нас, якія знаходзяцца ў Савецкім саюзе, але рабочую клясу ўсяго сьвету, гэтыя дырэктывы прыкавалі да сябе ўвагу ня толькі прыцяля ў рабочай клясы, але і нашых ворагаў.

Вы ведаеце, што да гэтага часу яшчэ вакол Савецкага саюзу існуе цэлы рад легенд аб тым, што ў Савецкім саюзе існуе прымусовая праца, што ў Савецкім саюзе існуе голад, што ў Савецкім саюзе мы маем зьбядненьне, што ў Савецкім саюзе рабочая кляса, працоўныя жывуць у выключна цяжкіх умовах. Кожны з вас памятае цэлы рад згідных праваакацыйных кампаній, якія разгорталіся вакол Савецкага саюзу, вакол нашай партыі буржуазнымі краінамі, пачынаючы ад «сьвятых айцоў», царквы і канчаючы тымі, якія называюць сябе «сацыялістамі», г. зн. сацыял-адрадніка і ўсе яны разам з тымі, якія былі выкінуты з Савецкага саюзу, як людзі, якія перашкаджаюць будаўніцтву сацыялізму, трацкістамі, меншавікамі, белагвардзейцамі і г. д.—стварылі адзіны фронт у справе праваакацыі і барацьбы супроць Савецкага саюзу і нашай партыі, у справе зрыву грандыёзнага плану сацыялістычнага будаўніцтва, у справе зрыву нашай першай пяцігодкі.

Таварышы, кожны з нас бачыць, што дзякуючы найвялікшым посьпехам у будаўніцтве сацыялізму за першыя пры гады пяцігодкі партыя, пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК на чале з правадыром партыі тав. Сталіным, забясьпечыла выкананьне першай пяцігодкі ў 4 гады. Больш таго, калі мы ў цэлым першую пяцігодку выконваем за 4 гады, то паасобныя галіны нашай прамысловасьці, як напрыклад, па нафтавай, машынабудаўнічай, электратэхнічнай і інш. мы пяцігодку выканалі ў 2—2 з паловаю гады.

Больш таго, мы ў зьніку работ першых трох год першай пяцігодкі маем цэлы рад найвялікшых посьпехаў у справе аўладаньня новай тэхнікай, у справе асваеньня новых вытворчасьцяй, у справе прасоўваньня ўперад у сэнсе будаўніцтва і асваеньня нябачных гігантаў індустрыі, як завод быў. «АМО» імя тав. Сталіна, Харкаўскі трактарны завод, аўтамабільны завод у Ніжнім Ноўгарадзе і г. д.

Адна справа, калі вы чытаеце, што ў пэўным месцы пушчаны новы нябачаны гігант. Але зусім іншая справа, калі кожны з вас пагледзеў бы, што на самай справе гэты гігант з сябе прадстаўляе, калі кожны з вас мог-бы, як гаворыцца, рукамі памацаць, што з сябе прадстаўляюць тыя новыя тыпы машын, якія выпускаюцца сёньня на заводах Савецкага саюзу. Такія машыны, якія па сваёй тэхнічнай канструкцыі і якасьці ня толькі не ўступаюць, але ў цэлым радзе выпадкаў перавышаюць машыны капіталістычных краін. Гэтыя гіганты гонар і гордасьць рабочае клясы, ёсьць творчасьць рабочых мас Савецкага саюзу і тэхнічнай інтэлігенцыі, творчасьць якой толькі ў Савецкім саюзе адкрыты новыя нябачаныя шляхі.

Гэты гіганцкі рост мы маем ня толькі ў галіне прамысловасьці. Калі мы возьмем сельскую гаспадарку, толькі 2—2 з паловаю гады таму назад у нас пытаньне аб калектывізацыі стаяла, як праблема. А сёньня мы маем у Савецкай Беларусі больш паловы калектывізаваных гаспадарак—гэта азначае, што бядняцка-серадняцкая маса сялянства парывае са сваімі прывычкамі, парывае са старымі пазыцыямі, што гэта сялянства ідзе ў ню вае жыцьцё, у калектыў, што гэта сялянства цьвёрда стала на шлях будаўніцтва сацыялізму.

Калгасная вёска на сёньня карэнным чынам, зьмяніла свой твар, калі мы на сёньня толькі ў БССР маем да 2.000 трактароў, дык толькі гэта адно гаворыць аб тым, наколькі сёньня зьмянілася тэхнічная база сельскай гаспадаркі.

У 1932 г. мы ў БССР ставім сабе задачу давесьці процант калектывізацыі да 65, гэта патрабуе ад нас бязумоўнай мабілізацыі ўсіх сіл, усіх сродкаў для сапраўднай арганізацыі мас на барацьбу з клясавым ворагам, які аказвае шалёнае супраціўленьне пасьпяховаму сацыялістычнаму будаўніцтву. Мы будуем сацыялізм у абкружэньні капіталістычных краін — г. зн., што ад нас, бальшавікоў, патрабуе выключнай пільнасьці, найвялікшага напружаньня сіл—і ў бальшавіцкай партыі непарымірымасьці ў барацьбе за генэральную лінію.

Правядзеньне генэральнай лініі партыі азначае сапраўды бальшавіцкую барацьбу за калектывізацыю сельскай гаспадаркі, за індустрыялізацыю краіны, а гэта значыць—стварэньне новай краіны, а гэта значыць—стварэньне магутнай прамысловай базы, базы буйнай індустрыі, буйнай сельскай гаспадаркі на высокай тэхнічнай аснове, гэта значыць, што калі мы гаворым аб ажыцьцяўленьні генэральнай лініі партыі за першую пяцігодку ў 1932 г. і другой пяцігодкі, то трэба разумець, што гэта патрабуе ад нас сапраўднага напружаньня сіл, энэргіі, волі бальшавікоў для таго, каб перамагчы труднасьці, для таго, каб канкрэтна ажыцьцёвіць гэту генэральную лінію партыі.

Вынікі першых трох год пяцігодкі паказалі, што наша партыя змагла не на словах, а на справе ажыцьцёвіць гэту генэральную лінію, змагла на справе ажыцьцёвіць лінію на індустрыялізацыю краіны, ажыцьцёвіць лінію на калектывізацыю сельскай гаспадаркі і на базе суцэльнай калектывізацыі ліквідацыі кулацтва як класы.

У зьніку трох год першай пяцігодкі мы дабіліся буйнейшых дасягненьняў, але ў нас ёсьць цэлы рад недахопаў, якія партыя ніколі ня ўтойвала і ня ўтойвае, якія партыя адкрыта ставіць з усёй сілай для таго, каб у далейшым іх перамагчы.

Мы ня выканалі заданьняў па прадукцыйнасьці работы, мы не змаглі выканаць заданьні па росту ўраджайнасьці, мы не змаглі выканаць задач па рэканструкцыі нашага транспарту. Вы ведаеце, што гэтыя задачы зьяўляюцца важнейшымі задачамі.

Таварышы, прайшло тры гады першай пяцігодкі. Мы выканалі першую пяцігодку, паўтараю ў жорсткай барацьбе супроць адхіленьняў ад генэральнай лініі партыі, супроць усіх, хто тармазіў, хто перашкаджаў практычна ажыцьцяўляць генэральную лінію партыі. Вы ведаеце, што на XV зьезьдзе партыі, калі прымаліся дырэктывы па першай пяцігодцы, партыя сустрэла рялікае супраціўленьне з боку так званых правых элемэнтаў і з боку трацкістаў. Яшчэ ў 1928 г. трацкісты выступілі супроць ЦК партыі, проста заяўляючы, што намячэньні па індустрыялізацыі, якія ўносіў ЦК УсеКП(б) зьяўляюцца невыстарчальнымі, не адпавядаюць інтарэсам рабочае клясы, што гэтыя намячэньні вядуць не да ўмацаваньня, а да паслабленьня рабочае клясы. Як на справе стрымалася в прадраканьнямі трацкістаў кожнаму ясна.

На XVI партыйнай канфэрэнцыі, калі прымаліся тэзісы па першай пяцігодцы правыя выступілі са сваімі контр-тэзісамі, з так званай «двухгодкай», пабудаванай па ўсіх лініях у процівагу нашай першай пяцігодцы, «двухгодкай», якая прадугледжвала перш за ўсё разьвіцьцё лёгкай прамысловасьці. Двухгодка не прадугледжвала абсалютна ніякіх работ у частцы магутнага разгорнваньня нашай цяжкой прамысловасьці, у частцы таго, каб стварыць сапраўды моцную базу для вызваленьня СССР ад капіталістычнай залежнасьці.

Ажыцьцяўленьне першай пяцігодкі ў жорсткай барацьбе супроць клясавага ворага,—кулака, нэпмана, у пасьлядоўнай барацьбе ўнутры нашай партыі, супроць усіх ухілаў ад генэральнай лініі партыі. Так стваралася і ажыцьцяўлялася першая пяцігодка.

Зразумела, таварышы, што ажыцьцяўленьне найвялікшай важнасьці задач пастаўленых у другой пяцігодцы, задач у галіне прамысловасьці, энэргетыкі, транспарту, падняцьця ма тар'яльна-бытавога і культурнага ўзроўню рабочае клясы, у галіне с.-г., будзе адбывацца ва ўмовах абвастрэньня клясавай барацьбе на радзе вучасткаў.

Зразумела, таварышы, што калі намячаецца ў другой пяцігодцы ліквідацыя капіталістычных элемэнтаў і клясаў наогул, то ў сувязі з гэтым у кожнага ўзьнікае цэлы рад пытаньняў: як-жа так,—думае напэўна кожны,—сёньня пачатак 1932 году, а праз якіх-небудзь пяць год выходзіць ня будзе ні дзяржавы, ніякай улады наогул, будзе поўны камунізм, кожны будзе атрымліваць па сваіх патрэбах, а не па працы, ня будзе ніякіх буржуазных тэндэнцый, дробна-буржуазных настрояў, будзе поўнае камуністычнае грамадзтва.

Зусім натуральна, таварышы, што пасьля апублікаваньня дырэктыў аб складаньні другога пяцігадовага плану ў зьніку цэлы рад новых пытаньняў, якія займаюць кожнага камуніста, кожнага рабочага, кожнага калгасьніка.

На XIV зьезьдзе КП(б)Б, калі толькі што былі апублікаваны дырэктывы па складаньні другога пяцігадовага плану, рад таварышоў ужо ставіў пытаньне, як-жа быць далей. Апрыялі-васцца-ж, што капіталістычнае акружэньне застаецца, вораг ня сьпіць і рантам—будуй сацыялізм, ліквідуй дзяржаву. Інакш і не разумелі, што пабудаваньне сацыялістычнага грамадзтва азначае ліквідацыю дзяржавы. І далей: «Дзяржава—гэта ёсьць цэнтральная і мясцовая ўлада, гэта ёсьць органы дыктатуры пралетарыяту, г. зн. саветы, гэта ёсьць армія, гэта ў цэлым складае магутны апарат дзяржавы. І вось выходзіць, што гэта ўсё трэба ліквідаваць». І вось, таварышы пры сустрэчы пыталі адзін у аднаго: «Ну як, вас ужо не намячаюць да ліквідацыі ў другую пяцігодку?» (сьмех). Раз ліквідуюць капіталістычныя элемэнты і клясы наогул, раз ліквідуюць апошнюю апору капіталістычных элемэнтаў у вёсцы—кулака, раз наступае поўнае сацыялістычнае грамадзтва, можна быць зусім супакойным за лёс сацыялістычнага грамадзтва, за тое, што нахто нас абсалютна не закране. Тав. Молатаў у сваім дакладзе паміж іншым спыніўся на тым, што некаторыя задаюць нават такое пытаньне: а што-ж будзе 1-га студзеня 1938 году? Вось паспрабуйце адказаць на гэта пытань не (сьмех). Бязумоўна, вы разумееце, таварышы, што так мэханічна ладыхадзіць да гэтага пытаньня зусім немагчыма, кожны з вас ведае, што калі партыя намеціла ў другой пяцігодцы ліквідацыю капіталістычных элемэнтаў, ліквідацыю клясаў наогул, то гэта яшчэ зусім ня значыць, што мы ставім пытаньне аб ліквідацыі дзяржавы.

Тав. Ленін у «Государство и революция», наступным чынам ставіць пытаньне аб дзяржаве:

«Пры капіталізьме мы маем дзяржаву ва ўласным сэнсе слове, асобную машыну для падаўленьня аднае клясы другой і пры тым большасьці меншасьцю. Зразумела, што для посьпеху такой справы, як сыстэматычнае падаўленьне меншасьцю эксплёататараў большасьці эксплёатуемых, патрэбна крайняя лютасьць, зьверства падаўленьня, патрэбны моры крыві, праз якія чалавецтва і вядзе свой шлях...»

«Далей, пры пераходзе ад капіталізму да камунізму падаўленьне яшчэ неабходна, але ўжо падаўленьне меншасьці эксплёататараў большасьцю эксплёатуемых. Асобны апарат, асобная машына для падаўленьня, «дзяржава» яшчэ неабходна, але гэта ўжо не дзяржава ва ўласным сэнсе...»

Вы, таварышы, бачыце, як Ленін ставіў пытаньне аб дзяржаве. Вы бачыце, што дзяржава, як асобны апарат, неабходна для клясы цяпер пануючай, г. зн. рабочай клясы. Дзяржава пры дыктатуры пралетарыяту, выконваючы функцыю, г. зн. абазвязак падаўленьня буржуазіі, праводзіць і другую работу—гэта будаўніцтва новага сацыялістычнага грамадзтва і паступова ў працэсе стварэньня новага сацыялістычнага грамадзтва ўзьнікае пытаньне аб тым, што на пэўнай стадыі пачынаецца адміраньне паасобных частак дзяржавы і дзяржавы ў цэлым. Ці выцякае з гэтага, што дзяржава ўжо на данай стадыі павінна быць ліквідавана? Ні ў якай ступені. Наадварот, іменна на данай стадыі дзяржава, як зброя рабочае клясы для поўнага падаўленьня і ліквідацыі капіталістычных элемэнтаў у краіне павінна быць усямерна ўзмоцнена для таго, каб пасьля падаўленьня і ліквідацыі капіталістычных элемэнтаў забясьпечыць пабудаваньне камуністычнага грамадзтва. Іменна так пастаўлена было пытаньне тав. Леніным у сваіх работах «Государство и революция». Я яшчэ на гэтым пытаньні потым спынюся.

Наступнае пытаньне, на якое трэба даць адказ, гэта пытаньне аб самой рабочай клясе. Калі-ж ліквідуюцца капіталістычныя элемэнты, калі ставіцца пытаньне аб ліквідацыі клясаў наогул, дык узьнікае пытаньне аб тым, што на сёньня прадстаўляе з сябе рабочая кляса і што з ёю будзе ў канцы другой пяцігодкі.

Тав. Молатаў у сваім выступленьні на партыйнай канфэрэнцыі асобна спыніўся на гэтым пытаньні. Тав. Молатаў паставіў пытаньне наступным чынам: пралетарыят, узяўшы ўладу ў свае рукі, падпарадкаваўшы сабе ўсе сродкі зьнешчасьці, зямлю, прамысловасьць, транспарт і г. д., з гэтага моманту пралетарыят у тым сэнсе, у якім ён разумеўся пры капіталістычнай дзяржаве, пралетарыят, як кляса эксплёатуемая, з таго моманту, як ён узяў у свае рукі ўладу і пачаў будаваць новую дзяржаву, у прыватнасьці, у нас у савецкай краіне,—істотна зьмяняецца. Пралетарыят у старым прадстаўленьні ўжо зьнік, ён пасьля зьвяржэньня самадзяржаўя і ўзяцьця ўлады становіцца пануючай сілай. Ён ужо па сутнасьці апраны ў тым старым фразуменьні, у якім ён разумеўся пры капіталізьме, ужо не зьяўляецца пралетарыятам. Ён ужо кляса зядучая, кляса пануючая, асноўная сіла, будуючая новае грамадзтва. Іменна так на сёньня стаіць пытаньне з рабочай клясай.

Таварышы, калі рабочая кляса ўзяла ў рукі ўладу, адабрала ў буржуазіі зродкі і прылады вытворчасьці, і пад яе кіраўніцтвам сялянская маса стала цьвёрда на шлях сацыялістычнага перабудаваньня сваёй гаспадаркі, дык само па сабе ўзьнікае пытаньне аб тым, што рабочая кляса пераходзіць ужо на новую, больш высокую ступень, яна становіцца клясай, ліквідуючай рэшткі капіталістычных элемэнтаў, ствараючай новае сацыялістычнае грамадзтва.

Іменна так стаіць пытаньне аб рабочай клясе.

Рабочая кляса, стаўшы пануючай сілай, павінна яшчэ больш умацаваць сваю пралетарскую дзяржаву. Задачы, якія стаяць перад нашай пралетарскай дзяржавай у 1932 годзе ў другой пяцігодцы патрабуюць выключнай мабілізацыі зродкаў, сіл, волі рабочае клясы і ўсіх працоўных на выкананьне ўсіх задач, якія пастаўлены ў 1932 годзе і тым самым забясьпечыць выкананьне задач, пастаўленых у другой пяцігодцы.

Рабочая кляса ў барацьбе за ўмацаваньне пралетарскай дыктатуры, у барацьбе з капіталістычнымі элемэнтамі за пасьпяховае выкананьне першай пяцігодкі, колькасна вырасла, загартавалася ў барацьбе, аўладае тэхнікай.

Колькасна вырасшая рабочая кляса папоўнілася новымі, маладымі па вытворчым стажы, кадрамі. Мы тут маем выхадцаў з вёсак, з дробна-буржуазных элемэнтаў гораду. Гэтыя маладыя рабочыя прынялі прынесьлі з сабой ў рабочае асяродзьдзе рад дробна-буржуазных настрояў і тэндэнцый. Гэта вымагае ад рабочых разгорнваньня рашучай барацьбы з гэтымі дробна-буржуазнымі настроямі і тэндэнцыямі і ў сваім уласным асяродзьдзі.

Але гэтага мала. Задача заключаецца ў тым, каб рабочая кляса ажыцьцяўляла кіраўніцтва і аказала дапамогу бядняцка-серадняцкаму сялянству пакончыць з дробнай, раздробленай аднаасобнай гаспадаркай, дапамагла перайсьці да сацыялістычных форм гаспадаркі.

Некаторыя таварышы, калі сёньня гавораць аб сялянстве, дык відавочна ня зусім ясна ўяўляюць, што сялянства на сёньня ўжо нешта новае, чым 2 і 3 гады таму назад, што мы маем больш паловы гаспадарак перайшоўшых да калектыўных форм земляробства, што аснoўная маса сялянства, серадняк, бядняк, яны сёньня з нами, яны сёньня зьяўляюцца актыўнымі будаўнікамі сацыялізму, што сялянства ў асноўным павярнулася да суцэльнай калектывізацыі, да будаўніцтва сацыялізму, пакінуўшы вялікі вопыт барацьбы з кулацтвам.

Сялянства на справе пераканалася ў перавагах сацыялістычных форм гаспадаркі. Калі ў капіталістычным грамадзтве для вялізарнай большасьці сялянства была пэрспэктыва абядненьня і толькі для нязначнай часткі была пэрспэктыва вырасьці ў кулака, дык на сёньня асноўныя масы бядняцка - серадняцкіх гаспадарак сталі актыўнымі будаўнікамі сацыялістычнага грамадзтва.

Другая пяцігодка дае вялізарныя пэрспэктывы ў справе машынабудаўніцтва, у справе сацыялістычнай перабудоўкі сельскай гаспадаркі і магчымасьці падвышэньня ўраджайнасьці, у справе пераходу на новую вышэйшую ступень тэхнікі, палепшаньня ўмоў працы і палепшаньня быту рабочых і сялянскіх мас. Зразумела, хістаньні ў сялянскім асяродзьдзі будуць яшчэ праяўляцца, будуць яшчэ адчувацца.

Сёньня няправільна сказаць, што ў калгасах няма элемэнтаў клясавай барацьбы, што там «тишь и благодать». Кожны з нас ведае, што там яшчэ ёсьць розьніца паміж уладайнымі тыпы батракамі і серадзякамі, ёсьць розьніца паміж цэлым радам груп. Пралезьці ў калгасы кулак і мкнецца распаліць там буржуазныя тэндэнцыі, разваліць калгас з сярэдзіны.

На гэту справу мы павінны сканцэнтраваць сваю ўвагу.

Мы маем вялізарную масу калгасаў, якія паказалі сябе ўзорнымі ў цэлым радзе работ, па пасеўнай кампаніі, па выкананьні збожжазагатоўзак і г. д. Ёсьць багаты вопыт будаўніцтва і практычнай работы калгасаў. У той-жа час хіба мы можам сказаць, што ўсе гэтыя калгасьнікі зжылі свае дробна-ўласьніцкія тэндэнцыі і настроі, хіба мы можам сказаць, што сялянства, якое ўвайшло ў калгасы, заўтра зусім мэханічна, так сказаць, ператварыцца ў актыўных будаўнікоў сацыялізму. Бязумоўна, не. Хістаньні ёсьць і будуць. Вы ведаеце, што ў галіне арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў у нас ёсьць рад сур'ёзных недахопаў. Да гэтага часу пытаньні правільнага ўліку рабочай сілы, працы і інвэнтару, у нас у БССР практычна яшчэ ня вырашаны, да гэтага часу далёка ня ўсюды правільна разьмяркоўваюцца даходы калгасаў і г. д. У нас у цэлым радзе месц ёсьць адміністраваньне ў адносінах да калгасаў. Мы ў радзе месц маем апартуністычнае акрыўленьне лініі партыі ў кіраўніцтве калгасамі. Супроць гэтага неабходна весьці самую рашучую барацьбу.

Зараз перад намі перад партыяй, перад рабочай клясай і калгасным сялянствам стаяць адказныя сур'ёзныя задачы. Іх трэба ажыцьцявіць ужо сёньня, гэта вымагае яшчэ больш а ўзмацненьня пралетарскай дзяржавы, яшчэ большага ўзмацненьня дыктатуры пралетарыяту.

Якія-ж гэта задачы?

Па-першае,—задача ліквідацыі капіталістычных элемэнтаў. Зусім відавочна, што гэта задача пасьпяхова выканаецца дзяржавай з наймацнейшай дыктатурай. Па-другое, — спыненьне вылазак контрэвалюцыі. Мы ведаем, што рэшткі контрэвалюцыйных элемэнтаў яшчэ будуць спрабаваць праводзіць сваю падрыўную работу па паасобных вучастках нашага будаўніцтва. Пытаньне аб супраціўленьні капіталістычных элемэнтаў разгорнутаму наступленьню сацыялізму яшчэ стаіць з усёй сваёй вострасьцю і гэта супраціўленьне мы павінны рашуча прыдушыць. Трэцяя задача—задача перавыхаваньня сялянства і іншых працоўных мас. Нам прыдзецца праводзіць яшчэ гігантскую работу па перавыхаваньні і арганізацыі працоўных мас на новай базе, на базе сацыялістычнага будаўніцтва.

Ясна, што гэтыя задачы цалкам і поўнасьцю зьвязаны з аснованьнем пралетарскай дзяржавы, дзяржавы з моцнай дыктатурай рабочай клясы, якая зможа і надалей задушыць усякія вылазкі клясавага ворага, якая са праўды зможа арганізаваць рабочыя масы, працоўных і сялянства пад кіраўніцтвам партыі на справу рашучага зжываньня рэшткаў дробна - буржуазных тэндэнцый і настрояў.

Чацьвертая задача, што стаіць перад намі, вынікае з супярэчнасьці паміж краінай, якая будуе сацыялізм, стварае сваю базу, базу цяжкай прамысловасьці, рэканструюе сельскую гаспадарку на сацыялістычнай базе і краінамі капіталізму, якія захоплены крызісам, у якіх галеча, голад, беспрацоўе з кожным годам, з кожным месяцам расьце. Адсюль нянавісьць да Савецкага Саюзу, адсюль жаданьне сарваць сацыялістычнае будаўніцтва ў Савецкім Саюзе, адсюль ня толькі спробы, а сапраўды, як гавораць, точаць нож для таго, каб усадзіць яго ў Савецкі Саюз.

І адсюль пытаньне аб яшчэ большым умацаваньні магутнасьці нашай савецкай сацыялістычнай дзяржавы. Іменна так тав. Молатаў паставіў пытаньне ў сваім дакладзе.

Тав. Ленін у сваёй кнізе «Государство и революция» праста гаворыць, што рабочай клясе патрэбен дзяржаўны апарат, патрэбна дзяржава, папершае, як апарат, пры дапамозе якога ён ліквідуе капіталістычныя элемэнты і рэшткі капіталізму. Па-другое, для таго, каб мы маглі заўсёды, ва ўсеўзброеньні процівастаўць пошукам капіталістычных краін магутнасьць нашай сацыялістычнай бацькаўшчыны.

Пры пастаноўцы пытаньня аб ліквідацыі клясаў і пабудове бясклясавага грамадзтва некаторыя таварышы ставяць пытаньне аб тым, што на радзе заводаў і ў калгасах, нават у сем'ях зараз абмяркоўваецца пытаньне аб тым, «як-жа: вось будзе сацыялізм, ураўнілаўку ліквідавалі, абязьлічку ліквідуюць, а быццам роўнасьці сапраўднай няма, які-ж гэта сацыялізм?». Да, таварышы, роўнасьць у тым сэнсе, у якім прывыклі яе разумець, іменна ў буржуазным сэнсе, яе няма і ня будзе. Нельга да пытаньня аб роўнасьці, да пытаньня аб руху грамадзтва да камунізму падыходзіць мэханічна. Да камуністычнага грамадзтва мы ідзем праз рад этапаў. Мы маем першую фазу разьвіцьця, калі зродкі вытворчасьці адабраны ў эксплёататараў і знаходзяцца ў руках рабочае клясы, у руках пралетарскай дзяржавы, калі асновы аднаўленьня капіталізму ліквідуюцца, але цэлы рад рэшткаў і перажыткаў капіталізму, рэшткаў буржуазнай дзяржавы ў выглядзе так званага «буржуазнага права» яшчэ будзе захоўвацца. Хіба можа быць, каб, скажам, з эпохі капіталізму людзі адразу перайшлі ў камуністычнае грамадзтва і каб усе перажыткі капіталізму ў эканоміцы і сьвядомасьці людзей адразу зьніклі. Ясна, што гэта ня верна. Зусім відавочна, што ў першай стадыі сацыялістычнага грамадзтва, на першай фазе разьвіцьця мы яшчэ ня ліквідуем цэлага раду супярэчнасьцяй, якія зьяўляюцца рэшткамі, перажыткамі капіталістычнага грамадзтва, у прыватнасьці, напрыклад, мы яшчэ ня можам ліквідаваць ужо зараз розьніцы паміж фізычнай і разумовай працай. Гэта розьніца ня будзе ліквідавана ні ў першай, ні нават у другой пяцігодцы. Разам з тым, зусім ясна, што мы ідзем па шляху ліквідацыі розьніцы паміж фізычнай і разумовай працай. Мы сталі на гэты шлях з часу Кастрычніцкай рэвалюцыі, калі ўзялі ў свае рукі зродкі вытворчасьці, зямлю, фабрыкі і г. д.

Калі ўводзіцца ўсеагульнае навучаньне, калі ў нас цяпер ня толькі ў нізжэйшую, але і ў вышэйшую школу можа паступіць любы рабочы, любы калгасьнік, дык гэтым самым даецца вялізарная магчымасьць людзям больш шпарка ўзьняцца. Калі мы падводзім пад нашу эканоміку нябачную тэхніку, прычым тэхніку на сацыялістычных, асновах, калі зродкі вытворчасьці знаходзяцца ў руках пралетарскай дзяржавы, дык гэта значыць, што ствараюцца новыя ўмовы для ліквідацыі розьніцы паміж разумовай і фізычнай працай. Калі мы ствараем кадры з людзей рабочай клясы, ствараем новыя кадры тэхнікаў, інжынэраў, агрономаў, настаўнікаў, людзей з вышэйшай адукацыяй, вялікімі тэхнічнымі ведамі, дык хіба гэта ўжо ня ёсьць пераход да новай фазы да пядзігадзьня вялізарнай масы працоўных на больш высокую ступень. Мы ўзьнімаем усю культуру ў цэлым. Усё гэта ёсьць тыя прадпасылкі, якія зьявяцца асновай для ліквідацыі розьніцы паміж фізычнай і разумовай працай. Аднак, якуль гэта розьніца ўсё яшчэ захоўваецца. Іменна так стаіць справа. Значыць зусім няправільна гаварыць, што мы ўжо зараз неадкладна, або, скажам нават, у канцы другой пяцігодкі ліквідуем усе элемэнты няроўнасьці. У свой час Лассаль у Гоцкай праграме германскай сацыял - дэмакратыі ставіў пытаньне аб неабходнасьці перадаць усе прадукты працы рабочаму, самому рабочаму. Маркс рэзка крытыкаваў гэтыя погляды Лассаля. На самай справе, хіба для сацыялізму патрабуецца, каб поўны прадукт працы рабочага быў перадан цалкам рабочаму. Нічога падобнага. Хіба можна забываць аб дзяржаўных фондах, аб фондах страхаваньня, аб цэлым радзе рэзэрвовых фондаў пралетарскай дзяржавы. Хіба рабочы калі - небудзь ня рэчыў або будзе пярэчыць супроць таго, каб поўная доля яго працы клалася-б у аснову сацыялістычнай перабудовы грамадзтва?

Цяпер аб узаемаадносінах паміж гарадам і вёскай. Ясна, што супярэчнасьці паміж горадам і вёскай яшчэ існуюць і да пэўнага часу будуць яшчэ існаваць. У дырэктывах ЦК да складаньня 2-й пяцігодкі проста сказана, што 2-я пяцігодка павінна стварыць усе ўмовы для поўнай ліквідацыі процілегласьці паміж горадам і вёскай. Вядома, адразу ліквідаваць гэту процілегласьць нельга. Тут неабходна цялкая і сур'ёзная ўпартая работа. У вядомай пастанове пленуму ЦК партыі аб гарадзкой гаспадарцы гаворыцца, што работа партыі па гарадзкой гаспадарцы ёсьць адна з частак агульнай работы па частцы ліквідацыі процілегласьці паміж горадам і вёскай.

Чаму гэта так? Зусім відавочна, наколькі мы ўсё больш будзем разьвіваць будаўніцтва гарадоў і, у прыватнасьці, раённых цэнтраў (у нас-жа ёсьць цэлы рад р-наў, упрадкаваных на аснове мястэчак і вёсак), разьвіваць гарадзкую гаспадарку, шляхі зносін, сувязь і г. д., мы тым самым усё больш і больш набліжаемся да таго, каб стварыць умовы да ліквідацыі процілегласьці паміж горадам і вёскай.

Энгельс у сваёй кнізе аб жыльлёвым пытаньні, якую цытаваў тав. Молатаў у сваім дакладзе на XVII партканфэрэнцыі, пісаў:

«Чысьцейшай утопіяй зьяўляецца жаданьне ператварыць сучаснае буржуазнае грамадзтва побач з жаданьнем захаваць сялянства як такавое. Толькі магчыма больш раўнамернае разьмеркаваньне насельніцтва па ўсёй краіне, толькі цесная сувязь індустрыі з зямельнай вытворчасьцю, побач з неабходным пасьпрэньнем сродкаў зносін—пры зьнішчэньні капіталістычнага спосабу вытворчасьці, што зьяўляецца праз пасылкай,—у стане вырваць сельскае насельніцтва з ізаляванасьці і тупасьці, у якой яно амаль незьмяненым знаходзіцца на працягу тысячагодзьдзяў» (Энгельс, «Жилищный вопрос»).

Паколькі мы разьвіваем прамысловасьць, транспарт і сувязь, паколькі мы наогул рушым наперад культуру, тэхніку і г. д., тым самым мы падрыхтоўваем зьнішчэньне процілегласьці паміж горадам і вёскай. З другога боку, у вёсцы стварэнцца новыя вытворчыя адносіны, якія ўсё больш і больш набліжаюць вёску да гораду. У сувязі з гэтым апошняя пастанова ЦК УсеКП(б) аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў набывае выключнае значэньне. ЦК з асаблівай сілай падкрэсьлівае неабходнасьць умацаваньня арцельнай формы калгасу, якую мы маем на сёньняшні дзень. Разам з тым, Цэнтральны Камітэт рашуча папярэджвае супроць усякіх спроб перакочыць праз арцель:

«Супроць гэтай небясьпечкі перакочваньня праз формы с.-г. арцелі, якая яшчэ не разьвіта выстарчальна і не замацавана, ЦК перасьцерагае ўсе партыйныя арганізацыі» (з пастановы ЦК ад 4 лютага 1932 г.).

Умацняючы арганізацыйна - гаспадарча калгасы ў іх арцельнай форме, будзем весьці сялянства да зжываньня і зьнішчэньня процілегласьці паміж горадам і вёскай. Гэта цалкам і поўнасьцю адпавядае ленінскаму капэрацыйнаму пляну, у якім Уладзімер Ільліч указваў, што шляхам і пры дапамозе калектывізацыі і яе арцельнай формы і на аснове прынцыпаў дабраахвотнасьці, пры падтрыманьні з боку дзяржавы шляхам стварэньня высокай тэхнічнай базы сельскай гаспадарцы—мы сапраўды палегчым пераход сялянства да сацыялізму.

Таварышы, у другой пяцігодцы пытаньне аб паляпшэньні матар'яльнейшых месц. Мы маем ужо значныя посьпехі ў справе паляпшэньня матар'яльна-бытавых умоў рабочай клясы. Мы маем бясспрэчныя дасягненьні ў жыльлёвым будаўніцтве, у разьвіцьці грамадзкага харчаваньня, камунальнай гаспадаркі і г. д. Партыя ставіць адзай з асноўных задач другой пяцігодкі—у два-тры разы павялічыць сьпіжэньне рабочых мас. У другой пяцігодцы мы будзем мець вялізарнейшае пасоўваньне наперад у справе дабрабыта паляпшэньня матар'яльна-бытавога абслугоўваньня рабочай клясы і шырокіх працоўных мас.

У сувязі з гэтым неабходна спынуцца на тых пытаньнях, якія мы павінны вырашыць у нас, у Беларусі. Па кан-

ПРАЦЯГ ДАКЛАДУ т. ГІКАЛО ГЛЯДЗІ НА 2-ой СТАРОНЦЫ

Аб правядзеньні XIV гадавіны Чырвонай арміі

ПАСТАНОВА ЦК КП(б)Б

Надыходзячую XIV гадавіну Чырвонай арміі правесьці, як масавую палітычную кампанію, пад знакам мабілізацыі шырокіх рабочых, калгасных і працоўных мас гораду і вёскі вакол практычнага вырашэньня чарговых задач сацыялістычнага будаўніцтва, на аснове рэалізацыі пастаноў XVII партканфэрэнцыі Усе КП(б) і XIV зьезду КП(б)Б. Падрыхтоўчую работу і сьвяткаваньне гадавіны цесна зьвязаць з барацьбой за прамфінплян, з выкананьнем пляну загатовак збожжа, лёна-валакна, мяса і лесу, з практычным ажыцьцяўленьнем шасьці паказаньняў т. Сталіна і пастановы ЦК УсеКП(б) ад 4-II аб чарговых мерапрыемствах па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, што зьяўляецца магутным фактарам узмацненьня абароназдольнасьці СССР.

Канкрэтна ЦК КП(б)Б прапануе правесьці наступныя мерапрыемствы:

1. На аснове папулярызацыі пастаноў XVII канфэрэнцыі УсеКП(б) і XIV зьезду КП(б)Б і згуртаваньня працоўных вакол партыі, накіраваць творчую ініцыятыву мас на выкананьне пляну работ намечаных на 1932 заключны год пяцігодкі, на далейшую барацьбу за генэральную лінію партыі, супроць апартуністаў розных кірунк

Вынікі XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі і XIV зьезду КП(б)Б

Даклад сакратара ЦК КП(б)Б тав. ГІКАЛО на сходзе менскага партактыву 9 лютага 1932 г.

трольных лічбах на 1932 год, прынятых у БССР, намячаецца ўкласьці ў жыльлёвае будаўніцтва 41 млн. руб., у камунальную гаспадарку—31 млн. р., асвоіць праграму жыльлёвага будаўніцтва ў 480 тыс. кв. мэтраў. Гэта лічбы немалыя. Даволі ўказаць, што праграма ў 480 тыс. кв. мэтраў раўна ўсяму жыльлёваму будаўніцтву Масквы за ўвесь 1931 г. Асвоўшы гэту праграму, мы зробім гіганцкі крок наперад ў справе падрыхтоўкі да другой пяцігодкі ў нас у БССР.

Таварышы, сёньня праводзіцца падвышэньне цэн на некаторыя прадукты і тавары.

Рабочая кляса ў асноўным разумее неабходнасьць падвышэньня цэн. Рабочая кляса разумее неабходнасьць правядзеньня гэтых мерапрыемстваў, рабочая кляса разумее, што намячэньні на 1932 год у частцы разгортваньня цэлага раду прадпрыемстваў, фабрык як на лініі цяжкай, так і па лініі харчовай прамысловасьці і г. д. патрабуюць дадатковай мабілізацыі сродкаў, патрабуюць дадатковых укладаньняў. Мы сёньня цэлы рад тавараў прадаем больш таньна сабекошту, цярпім на гэтай справе страты, а калі ўлічыць, што ў 1931 годзе на адным толькі заработнай плаце было перарасходвана больш 5 млрд. рублёў, дык вы можаце зрабіць вывад, наколькі гэта мерапрыемства неабходна.

Але побач з гэтым мы павінны прадявіць больш павышаныя патрабаваньні да работы нашай каапэрацыі і дзяржгандлю ў частцы абслугоўваньня спажыўца, у частцы якасьці тавару, які адпускаецца. Каапэрацыя павінна ў блізкейшы час так перабудаваць сваю работу, каб паказаць узоры культурнага савецкага гандлю, узоры абслугоўваньня шырокіх рабочых і працоўных мас.

Таварышы, для паляпшэньня матар'яльна-бытавых умоў рабочай клясы пытаньні рашучага разгортваньня савецкага гандлю, гандлёвай сеткі, пытаньні работы каапэрацыі і г. д. набываюць рашаючае значэньне. У свой час тав. Ленін даў лёзунг: «Вучэцеся гандляваць». Сёньня і імённа сёньня на парозе другой пяцігодкі гэты лёзунг набывае вялізарнейшую важнасьць.

У асаблівасьці нам неабходна дабіцца найшырэйшага разгортваньня раздробнага гандлю. Гэта задача мае найвялікшае значэньне, што падкрэсьлена тав. Молатавым у яго дакладзе на ўсесаюзнай партканфэрэнцыі.

Таварышы, мы стаім на мяжы другой пяцігодкі. Нам трэба выканаць гіганцкую праграму чацьвертага—апошняга году першай пяцігодкі. У другім пяцігодзьдзі мы павінны канчаткова ліквідаваць капіталістычныя элементы і клясы наогул і пабудаваць бясклясавае сацыялістычнае грамадзтва. Усе гэтыя сусьветна-гістарычныя задачы патрабуюць ад нас максымальнай мабілізацыі нашых сіл і энэргіі, яшчэ большага згуртаваньня нашых радоў вакол ленінскага Цэнтральнага Камітэту.

Наша партыя за прайшоўшыя гады яшчэ больш узрасла і ўмацавалася. Рады большавікоў, як ніколі, згуртаваны вакол Цэнтральнага Камітэту і правадыра партыі тав. Сталіна. З дня ў дзень мацнее аўтарытэт партыі ў вачох рабочай клясы і найшырэйшых працоўных мас. У наяўнасьці вялізарны рост нашай партыі. У прыватнасьці, КП(б)Б у 1931 годзе прыняла ў свае рады 17 тысяч чалавек. У асноўным у партыю прыходзяць, галоўным чынам, карэнныя пралетары, старыя рабочыя.

Наша партыя расла і загартоўвалася ў непрымірымай барацьбе на два фронты. Пад ленінскім кіраўніцтвам Цэнтральнага Камітэту, на чале з тав. Сталіным, наша партыя разграміла трацкізм, які стаў перадавым атрадам міжнароднай контр-рэвалюцыі. Партыя бязьлітасна змагалася і змагаецца супроць правага апартунізму—галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць «левых» і прымірэнцтва.

Партыя пераможна правяла гіганцкую барацьбу і на тэарытычным фронце за ідэйвую чыстату сваіх радоў. Ліст тав. Сталіна ў рэдакцыю «Пролетарской рэволюции» мабілізаваў усю партыю супроць трацкісцкіх контрабандыстаў, супроць усіх і ўсялякіх фальсіфікатараў гісторыі нашай партыі, супроць гнілога лібэралізму.

Наша партыя ня толькі ідэёва і арганізацыйна ўзрасла і загартавалася, але і накапіла вялізарнейшы вопыт у справе сацыялістычнага будаўніцтва. У гэтай барацьбе наша партыя стварыла ўсе тыя прадпасылкі, якія забясьпечваюць пасьпяховае выкананьне першай пяцігодкі за чатыры гады і ажыцьцяўленьне тых найвялікшых задач, якія стаяць перад намі ў другім пяцігодзьдзі. І таму наша задача—яшчэ больш умацоўваць нашу ленінскую партыю, яе кіруючую ролю, яе бальшавіцкую дысцыпліну.

Першая пяцігодка яшчэ ня скончана. У першай пяцігодцы застаецца яшчэ чацьверты—заключны год. У гэтым годзе намечана выключна вялізарная праграма ў галіне разгортваньня лёгкай індустрыі, харчовай прамысловасьці і г. д. Акрамя гэтых новых задач, настаўленых партыяй зараз ва ўвесь рост, асновай нашай работы па-ранейшаму застаецца барацьба за фарсаванае разьвіцьцё машынабудаўніцтва, за энэргетыку, вугаль, мэталь, чыгун, за электрыфікацыю.

Паглядзеце на кантрольныя лічбы 1932 году па БССР. Гэтыя лічбы сьведчаць аб тэй гіганцкай рабоце, якую мы павінны будзем прарабіць у гэтым годзе.

У прамысловасьць мы ўкладаем 162 млн. руб. Па лініі якасных паказьнікаў мы павінны павялічыць прадукцыйнасьць працы на 26,9 проц. і зьнізіць сабекошт на 8,1 проц. У 1932 годзе мы павінны забясьпечыць рост пасяўнай плошчы ня менш, чым на 33 проц. Вялізарныя задачы стаяць перад намі ў галіне жывёлагадоўлі. Даволі ўказаць, што толькі па калгасах сьвіное стада павінна павялічыцца на 126 проц.

Праграма 1932 году намячае давесьці энэргаўзброенасьць сельскай гаспадаркі БССР па трактарным парку да 107 тыс. конскіх сіл. Гэтыя лічбы, вядома, яшчэ далёка ня вычэрпваюць усёй праграмы на 1932 год, але і яны ярка паказваюць, якую вялізарную і напружаную праграму мы павінны ва што-б там ні стала выканаць у апошні год першай пяцігодкі.

Мы стварылі асноўную базу сацыялізму—буйную цяжкую індустрыю, на аснове якой ў другой пяцігодцы будзе завершана сацыялістычная рэканструкцыя ўсёй народнай гаспадаркі. Мы канчаткова падарвалі карэнныя капіталізму ў вёсцы і забясьпечылі рашучы паварот асноўных мас сялянства на шлях сацыялізму, шлях суцэльнай калектывізацыі. Мы разграмілі клясавага ворага і паставілі перад сабой задачу—поўнасьцю ліквідаваць усе капіталістычныя элементы ў СССР у другім пяцігодзьдзі. Партыя паставіла пытаньне аб ліквідацыі клясаў, наогул, у другім пяцігодзьдзі. Гэтыя перамогі наша партыя атрымала ў бязьлітаснай і непрымірымай барацьбе супроць усіх і ўсялякіх апартуністаў, гэтыя перамогі партыя заваявала, ня гледзячы на шалёнае супраціўленьне клясавых ворагаў і іх апартуністычнай агентуры, ня гледзячы на ўсе капітулянцкія прароцтвы правых і «левых» апартуністаў. Няма ніякага сумненьня, што праграма 1932 году будзе выканана. Няма ніякага сумненьня, што мы задачы другой пяцігодкі выканаем. Але ня трэба забываць, што гэтыя задачы ня могуць быць вырашаны ў парадку самацёку. Работа наша будзе праходзіць ва ўмовах жорсткай клясавай барацьбы. Няўхільная барацьба ў рабоце супроць самацёку павінна і надалей праводзіцца ўсёй партарганізацыяй. Барацьба на два франты, у асаблівасьці супроць правага ўхілу, які выступае супроць бальшавіцкіх тэмпаў, застаецца і на сучасным этапе галоўнай небясьпекай.

Нельга заспакойвацца на дасягнутых посьпехах. Праграма 1932 году ў дзе выканана пры ўмове бальшавіцкіх тэмпаў работы на ўсіх вучастках нашага будаўніцтва. Трэба калёным жалезам выпальваць усякае благадушша, усякія дэмабілізуючыя настроі. Трэба ўдесяцярыць нашу клясавую пільнасьць, бо клясавая барацьба на асобных вучастках ва ўмовах ліквідацыі капіталістычных элементаў будзе абвастрацца. Разгромлены, але яшчэ не ліквідаваны, клясавы вораг будзе прабаваць праводзіць сваю падрыўную работу на асобных вучастках нашага будаўніцтва. Трэба ўлічыць, што на некаторыя прадпрыемствы пралязаюць клясава-варожыя элементы, кулакі і нэпманы якія не ганьбуюць ніякімі сродкамі, каб пашкодзіць нашаму будаўніцтву. Адсюль—задача максымальнага ўзмацненьня клясавай пільнасьці кожнага камуніста і камсамольца, кожнага рабочага і калгасьніка. Адсюль задача максымальнага ўзмацненьня нашай пільнасьці на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва—на фабрыках і заводах, у саўгасах і калгасах і г. д.

Ясная справа таксама, таварышы, што міжнародны імпэрыялізм імкнецца выкарыстаць усе магчымасьці для таго, каб сарваць пляны сацыялістычнага будаўніцтва. Інтэрвэнцыя японскага імпэрыялізму супроць Кітаю па сутнасьці зьяўляецца адным з зьвеньняў у падрыхтоўцы капіталістычных краін да вайны супроць СССР. Разьлікі імпэрыялістаў ясны. Захапіўшы Манчжурыю, акупанты прабуюць ператварыць у сваю калёнію і ўвесь Кітай у цэлым, зьнішчыць кітайскія саветы і падрыхтаваць вайну супроць Савецкага Саюзу.

Зразумела, таму, што асабліва тут на рубяжы з капіталістычным сьветам насьцярожанасьць і пільнасьць бальшавікоў і рабочай клясы павінны быць выключнымі.

Ніякай расхлябанасьці, ніякаму благадушшу ня можа быць месца. Трэба ўзьняць пільнасьць, узьняць тэмпы работы, па-бальшавіцку змагацца за якасьць на ўсіх вучастках нашага будаўніцтва.

Партыя разграміла трацкістаў. Мы змагаліся і будзем непрымірыма змагацца з правым ўхілам, памятаючы, што правы апартунізм застаецца галоўнай небясьпекай і на сёнешнім этапе нашай работы. Нельга благадушна заяўляць, што мы будуем сацыялізм і на гэтым заспакойвацца. Нельга дапускаць ніякага благадушша, ніякага заспакаеньня ў пытаньнях клясавай барацьбы, у пытаньнях барацьбы за індустрыялізацыю, за сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі, за бальшавіцкія тэмпы ўсяго нашага будаўніцтва. Увесь прамфінплян трэба выконваць ня заўтра, а сёньня. Ня заўтра, трэба змагацца за тэхніку, а сёньня. Калі рабочыя заводу «Бальшавік» асвоілі новую вытворчасьць без дапамогі замежных спэцыялістаў, калі рабочыя менскай электрастанцыі самі, уласнымі сіламі змаглі асвоіць ртутныя выпрамітэль, дык гэта і ёсьць канкрэтная бальшавіцкая барацьба не на словах, а на справе за генэральную лінію нашай партыі.

Нездавальняючая работа прамысловасьці БССР у студзені гаворыць, што мы і да сёнешняга дню не разгарнулі сапраўднай бальшавіцкай барацьбы за рэалізацыю шасьці ўмоў тав. Сталіна. У нас, таварышы, некаторыя работнікі за разважаньнямі аб другой пяцігодцы забылі канкрэтна аб сёнешнім дні, забылі аб тым, што барацьба за рэалізацыю шасьці гістарычных умоў перамогі, шасьці ўказаньняў тав. Сталіна зьяўляецца нашай важнейшай баявой задачай. Гэтыя людзі забываюць, што сёньня ў нас—апошні год пяцігодкі, што студзень 1932 году больш не паўторыцца, што сёньня люты 1932 году ўжо ўходзіць і пры гэтым уходзіць з некаторымі ганебнымі для нас лічбамі. Трэба добра ўявіць сабе, што ўжо сёньня, а ня заўтра, мы павінны рашуча змагацца за прамфінплян, за паляпшэньне матар'яльна-бытавых умоў рабочай клясы, за выкананьне ўсіх відаў загатовак.

Цэнтральны Камітэт КП(б)Б намеціў рад мерапрыемстваў, зьвязаных з практычнай барацьбой за праграму 1932 году. Доўг кожнага камуніста—з сапраўднай рэвалюцыйнай энэргіяй, канкрэтна і апэрацыйна на справе змагацца за рэалізацыю шасьці ўмоў тав. Сталіна, за бальшавіцкія тэмпы і якасьць нашай работы на ўсіх вучастках сацыялістычнай будоўлі.

Перад намі стаіць задача—таксама яшчэ больш узмоцніць барацьбу за марксычка-ленінскае выхаваньне партыйных мас. Мы павінны, закасаўшы рукавы, практычна змагацца за выкананьне стаячых перад намі гаспадарчых задач і разам з тым ні на адну мінуту ня ўпускаць з-пад увагі пытаньні тэорыі.

У барацьбе за бясклясавае сацыялістычнае грамадзтва мы пераможам; пераможам таму, што ў нас ёсьць такі ленінскі Цэнтральны Камітэт, што ў нас ёсьць такі правадыр, як тав. Сталін, якія сваім выпрабаваным кіраўніцтвам забясьпечаць наша далейшае пераможнае прасоўваньне наперад, па шляху да сацыялізму. (Бурныя аплёдысмэнты).

Партыйная нарада па кадрах

Усебеларуская партыйная нарада па кадрах адбудзецца 25 лютага г. г. пры ЦК КП(б)Б з наступным парадкам дня:

1. Вынікі і чарговыя задачы ў галіне вырашэньня праблемы кадраў і кантрольныя лічбы па кадрах 1932 г. (Дакл. т.т. Кухаркіна і Шапіра—Дзяржкіпм).

2. Аб становішчы і мерапрыемствах па падрыхтоўцы кадраў калгасных брыгадзіраў, кіраўнікоў фэрм і трактарыстаў у сувязі з задачамі арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, (дакл. т.т. Міцькоў—Калгас цэнтр, Каршакевіч—Трактарацэнтр, Сарока—Слуцкі Райкалгассаюз і калгас, сьвіналодчая фэрма пры калгасе імя Калініна—Церахаўскага раёну—дакл. т. Чубрыкава, малочная калгасная фэрма імя Энгельса—Уваравіцкага раёну, ільнаводны калгас Лёзьнянскага раёну, дырэктар Ветрынскай МТС—т. Суднік).

3. Аб становішчы і падрыхтоўцы кадраў для тарфяной і будаўнічай прамысловасьці—дакл. Малашонак (Белторф), т. Нісьневіч (Будматар'ялы), т. Баскін (НКПрацы), т. Лоцманаў (Асінторф), торфазавод «Шлях Сацыялізму»—Добруш, дырэктары цагельных заводаў: Віцебску т. Фурман, Менску—т. Верхалеўскі.

4. Аб барацьбе з цяжучасьцю кіраўнічых кадраў і стварэньні рэзэрву (дакл. т. Агранёўскі).

5. Аб становішчы падрыхтоўкі кадраў спажывецкай каапэрацыі і снабжэньня (дакл. т.т. Шапіра—БКС, т. Белян—НКСнаб, Райспажыўсаюз—Пухавічы).

На нараду выклікаюцца загадчыкі аддзеламі кадраў гаркомаў і райкомаў—8 чал., загадчыкі Арглістраў райкомаў—15 чал., дырэктары і сакратары партячэек буйных прадпрыемстваў і новапабудоў—12 чал., дырэктары МТС—3 чал., старшыні райкалгассаюзаў—6 чал., старшыні калгасаў—2 чал., кіраўнікі жывёлагадоўчых фэрм—1, сьвінагадоўчай—1, дырэктары торфазаводаў—4 чал., дырэктары цагельных заводаў, старшыні райспажыўсаюзаў—6 чал., старшыні ЗРК—4 чал., дырэктары інстытутаў і сакратары парткалектываў—6 чал., дырэктары тэхнікумаў—8 чал., дырэктары саўгасаў—5 чал.

Апроч таго загадчыкі аддзеламі кадраў цэнтральных устаноў (гор. Менску), дырэктары і сакратары партячэек інстытутаў і тэхнікумаў—Менск, дырэктары і сакратары партячэек буйных прадпрыемстваў Менску.

Рэйд-праверка абслугоўваньня нацменшасьцяй

Нацыянальная камісія пры ЦВК БССР, ЦКК-РСІ і Прэзыдыум ЦСПСБ праводзяць, пачынаючы з 19 лютага, масавую праверку-рэйд становішча нацыянальнай і інтэрнацыянальнай работы на прадпрыемствах і ўстановах гор. Менску.

У гэтым рэйдзе прымуць удзел ударнікі прадпрыемстваў, работнікі ўстаноў, рэдакцыі газэт «Савецкая Беларусь» і «Акцябр».

Змагацца за кожнае кілё лёнавалакна

ЦК КП(б)Б даў цьвёрдую ўстаноўку аб тым; што да 1-га сакавіка павінны быць поўнасьцю завершаны лёназагатоўкі. Аднак ня гледзячы на гэта, да апошняга часу мы маем надзвычайна марудныя тэмпы лёназагатовак. На 10-га лютага агульны плян па лёна-валакну выкананы на 54,1 проц.

Рад раёнаў ганебна плятуцца ў хвасьце гэтай кампаніі. Бягомльскі раён выканаў плян загатовак лёна-валакна толькі на 31,5 проц., Горацкі—39,8 проц., Дубровенскі—39,5 проц., Копыльскі—21,4 проц., Менскі—32,5 проц., Старадарожскі—37,5 проц., Смалявіцкі—37,2 проц., Чачэрскі—30 проц. і г. д.

Асабліва адстае аднаасобны сэктар. У той час як калгасы выканалі плян на 68 проц., аднаасобнікі ледзь дасягнулі 37,5 проц. Некаторыя раёны па аднаасобным сэктары выканалі плян лёназагатовак у самых нязначных разьмерах: Бягомльскі—9,2 проц., Менскі—15 проц., Мсьціслаўскі—17,3 проц., Сураскі—12,3 проц. і г. д. Прычыны лённага адставаньня аднаасобнага сэктару хаваюцца ў адсутнасьці арганізацыйна-масавай работы. Раённыя арганізацыі і сельсаветы не праявілі належнага апэрацыйнага кіраўніцтва лёназагатоўкамі па аднаасобным сэктары.

Другой ня менш важнай прычынай яўна нездавальняючых тэмпаў лёназагатовак зьяўляецца патураньне кулаку, адсутнасьць рашучых мер да тых кулацка-заможных гаспадарак, якія ня выконваюць плян здачы лёну па цьвёрдых заданьнях.

Пляны лёназагатовак зусім рэальныя, у гэтым пераконвае нас тое, што рад раёнаў іх ня толькі выканалі, але і перавыканалі. Так, Любаньскі раён выканаў плян на 101,8 проц., Лоеўскі—120 проц., некаторыя раёны набліжаюцца да поўнага выкананьня: Гомельскі—98,2 проц., Заслаўскі—95,2 проц., Крычаўскі—94,3 проц., Уваравіцкі—97,2 проц., Нараўлянскі—91,3 проц. і г. д. Гэтыя раёны дабіліся такіх посьпехаў дзякуючы ўдарнай рабоце ўсіх партыйных арганізацый, савецкіх органаў і загатоўчага апарату і бязьлітаснага націску на кулака.

Бліжэйшыя дні павінны зьявіцца рашаючымі ў выкананьні плянаў лёназагатовак. Да 1-га сакавіка пляны лёназагатовак павінны быць поўнасьцю выкананы.

Загатоўкі тэхкультур не арганізаваны

Мсьціслаўль. (Ад наш. выязд. брыгады). Люты зьяўляецца рашаючым у выкананьні плянаў загатовак тэхкультур. Між тым апошняя зводка аб загатоўцы тэхкультур па раёне сігналізуе аб недапушчальным пасляпленьні тэмпаў загатовак.

Плян загатовак лёнавалакна на 10 лютага выкананы на 64 проц. Яшчэ горш стаіць справа з выкананьнем пляну загатовак пянькі (15,28 проц.). Як і раней адстае аднаасобны сэктар. Калі калгасы плян загатовак лёнавалакна выканалі на 76,8 проц., дык аднаасобны сэктар выканаў яго толькі на 19,8 проц. Цьвёрдыя заданьні па тэхкультурах выкананы ўсяго на 45,2 проц.

Асабліва дрэнна праходзяць загатоўкі лёнавалакна ў Мазелаўскім сельсавеце, які выканаў плян па калгасах на 50,2 проц., па аднаасобным сэктары 30,3 проц., Шамаўскім—калгасы 52,3 проц., аднаасобнікі 48,6 проц., Татаршчынскім—калгасы 56,2 проц., аднаасобнікі—19,8 проц.

Вельмі адстае з загатоўкай пянькі Дудычцкі сельсавет, дзе калгасы выканалі плян на 10,4 проц., аднаасобнікі—14,3 проц.

У радзе калгасаў наглядаюцца злачынныя адносіны да апрацоўкі лёну. Так, напрыклад, у калгасе «13-ы кастрычнік», Шамаўскага сельсавету не прыступілі да апрацоўкі лёну і канапель, лён і канопкі сваячасова ня былі вынуты з мачальных ям.

Старшыня калгасу Едкоў злачынна-нядбайна адносіцца да сваіх абавязкаў. Замест таго, каб кіраваць калгаснай гаспадаркай Едкоў п'янствуе з кулакамі і падкулачнікамі, вельмі рэдка бывае ў калгасе.

Ганебнае адставаньне раду сельсаветаў у выкананьні плянаў загатовак тэхкультур зьяўляецца вынікам апартуністычнай стаўкі на самацёк з боку кіраўнікоў гэтых сельсаветаў і калгасаў, адсутнасьці масава-растлумачальнай работы, направільнай арганізацыі працы ў калгасах, патураньня кулаку, які ўпарта ня выконвае цьвёрдых заданьняў і вядзе шалёную агітацыю супроць сваячасовай апрацоўкі і здачы лёну.

У тых сельсаветах, дзе добра разгорнута работа, пляны загатовак тэхкультур выкананы і перавыкананы. Узорныя прыклады барацьбы за тэхкультуры паказваюць Старасельскі сельсавет, які выканаў плян загатовак лёнавалакна на 112 проц. Янаўскі 102 проц., калгасы Рылаўскі 114,2 проц., Пяцюкаўскі—на пяньцы—125 проц.

Гэтыя прыклады яшчэ раз да пячэ ту разьбіваюць апартуністычныя разважаньні аб нерэальнасьці плянаў. Яны сьведчаць аб тым, што пры жаданьні і ўмельні працаваць па новаму можна ня толькі выканаць, але і перавыканаць пляны загатовак тэхкультур.

Трэба рашуча ўдарыць па апартуністычнай стаўцы на самацёк, разгарнуць шырокую масава-арганізацыйную работу сярод калгасьнікаў і бядняцка-сераднякіх мас раёну, прымусіць кулацкія гаспадаркі выканаць цьвёрдыя заданьні.

Мсьціслаўскі раён удасьлічае ў гаворным спаборніцтве перадавых раёнаў СССР. Неадкладнай задачай раённых і сельскіх арганізацый Мсьціслаўшчыны зьяўляецца мабілізацыя шырокіх калгасных і бядняцка-сераднякіх мас на сваячасовае выкананьне і перавыкананьне загатовак тэхнічных культур.

І. Маркаў, С. Громаў.

Прынцыповасьці" і безгаспадарчасьць полацкіх галав пяпаў

ПОЛАЦАК. (Наш спэкор). Пробны пуск Ветрынскага лёназаводу паказаў, што турбіна не прыстасавана і завод ня можа працаваць,—патрабуецца зьмена частак і цэлага раду тэхнічных прылад.

Пакуль-жа на заводзе ляжыць 550 тон трасты; частка яе зложана ў пад навець, а большая частка ляжыць у торпах пад адкрытым небам. Торпы складзены не па-гаспадарску, не завершаны, з прычыны чаго траста мок не пад дажджом і сьнегам.

Паводле меркаваньня дырэкцыі, працуючая здольнасьць лёназаводу складае максымум 2 тоны ў 8 гадзін. Такім чынам, калі пусьціць завод на поўны ход, у тры зьмены, дык можна будзе закончыць апрацоўку лёну толькі ў 4 месяцы.

З прычыны недагаворанасьці дырэкцыі заводу з праўленьнямі некаторых калгасаў пра стандарт трасты, нагнаяцца выпадкі, калі ля прынятая траста валяецца ў кучах, пад адкрытым небам. Калгас імя Крупскай, Шпакоўшчынскага сельсавету, прывёз на завод каля 3 тон трасты, якая была забракавана. Тады калгас пакінуў трасту на полі ля заводу.

Дырэктар лёназаводу заявіў, што «прынцыпова не прымаецца да гэтага лёну», а старшыня калгасу імя Крупскай, заявіў, што, «прыдзіцца не забірае лён». Пакуль бюракраты спрачаюцца за «прынцыповасьць», лён гніе на полі под дажджом і сьнегам.

Полацкаму РВК неабходна прыняць зрабіць загад каб траста на лёназаводзе належна захоўвалася. Вінаватыя ў злачынным псаваньні трасты павінны быць прыцягнуты да суровай адказнасьці.

Л. Хома

Па СССР

ПРАЛЕТАРЫЯТ СССР ВІТАЕ ВЫСТУПЛЕНЬНЕ т. ЛІТВІНАВА НА ЖЭНЭЎСКАЙ КАНФЭРЭНЦЫІ.

КІЕЎ, 16-II. Рабочы калектыў Кіеўскага машына-будаўнічага заводу імя Домбаля зьвярнуўся з тэлеграмай да тав. Літвіноваа, у якой горача вітае яго выступленьне на канфэрэнцыі па разброеньні ў Жэневе, адбіваючае пасьлядоўную барацьбу Савецкага Саюзу за мір і выратаваньне чалавецтва ўсяго сьвету ад новай жудаснай вайны, якую рыхтуюць імпэрыялісты.

«Працоўныя масы СССР—гаворыцца ў тэлеграме,—з непаслабнай увагай сочаць за тым, што адбываецца ў Жэневе, мабілізуючы ўсе сілы для рашучага пралетарскага адпору імпэрыялістычным падпальшчыкам вайны і на абарону бацькаўшчыны сусьветнага пралетарыяту.

— Мы лічым,—заяўляюць у заключэньне рабочыя,—што лепшай падтрымкай барацьбы за разброеньне будзе пасьпяховае і датэрміновае выкананьне прамфінпляну ў 1932 годзе і сапраўдная бальшавіцкая падрыхтоўка да другой пяцігодкі».

Загатоўкі новы прэзыдыуму УсеЦСПС аб правядзеньні в сноўай пасеў кампаніі

Для забясьпячэньня выкананьня плянаў веснавой сяўбы, прэзыдыум УсеЦСПС паставіў перад прафарганізацыямі рад практычных задач.

Саўпрафы, па тэрыторыі якіх маюцца прадпрыемствы, што вырабляюць с-г машыны і запасныя часткі, павінны неадкладна прыняць ўсе меры для выкананьня прамфінпляну гэтых прадпрыемстваў.

Прафсаюзы павінны дамагчыся рашучага пералому ў ходзе рамонтнай кампаніі ў майстэрнях саўгасаў і МТС. Прафарганізацыі павінны дабіцца павялічэньня прадукцыйнасьці работы і зьняцьця якасьці рамонту шляхам арганізацыі гаспадарча-разьлікавых брыгад, зьменна-сустрэчнага плянаваньня, увядзеньня зьдзельшчыны і правільнага скарыстаньня рабочай сілы.

Не пазьней 5 сакавіка трэба скончыць правядзеньне ва ўсіх саўгасах і МТС вытворчых нарад.

Разгортваючы сацыпаборніцтва і ўдарніцтва, рабочкомы калгасаў і МТС асаблівую ўвагу павінны зьвярнуць на барацьбу за беражлівае і 100-процантнае скарыстаньне трактароў і с-г інвэнтара і эканомію гаручага.

Усім саўпрафам УсеЦСПС зрабіць асаблівую ўвагу зьвярнуць на ажыцьцяўленьне дырэктыў ЦК УсеКП(б) аб умацненьні калгасных брыгад і правядзеньні зьезьмычны ў калгасах. Прафарганізацыям прапануецца садзейнічаць калгасам у правядзеньні курсаў брыгадзіраў, выдучэньні лепшых калгасьнікаў, ударнікаў, брыгадзіраў, у арганізацыі вытворчасьці і правільнай расстаноўцы рабочай сілы, цягла і інвэнтара. ЦК саюзу чыгуначнікаў прапануецца неадкладна арганізаваць кантрольныя пасты для садзейнічаньня хутчэйшаму прасоўваньню пасеўных груз заў.

Другі ўсесаюзны конкурс спаранных

МАСКВА. 16-II. «Правда», НКШЗ, ЦК чыг. і «Гудок» з 1-га сакавіка па 1-га мая г. г. праводзяць другі ўсесаюзны конкурс спаранных паравозных брыгад імя XVII партканфэрэнцыі. Вынікі першага конкурсу паказалі, якое вялізарнае гаспадарча-палітычнае значэньне мела ўсесаюзнае спаборніцтва паравозьнікаў.

Конкурс ускалыхнуў мільённую масу чыгуначнікаў і ўзьняў хвалю энтузіязму ў барацьбе за бальшавіцкае ўдараўленьне транспарту. У другім конкурсе будуць удзельнічаць 300 лепшых паравозных брыгад. 48 паравозаў будуць прэм'яваны. Лепшая дарога атрымае пераходны сьцяг «Правды» і грашовую прэмію. Будуць прэм'яваны таксама 3 транспартныя газэты, якія найлепш мабілізуюць чыгуначную грамадзкасьць і арганізавана правядуць конкурс. Адборачнае прэм'яваньне па дарогах павінна закончыцца ад 5-га сакавіка.

«Пераходны дасягненьні лепшых машыністаў СССР»—такі баявы лёзунг другога конкурсу. На прэм'яваньне адпушчана 450 тыс. рублёў.

Спаборніцтва пісьменьнікаў

МАСКВА. 16-II. У сувязі з падрыхтоўкай да 15-й гадавіны Кастрычніка ў УсеЦСПС, Наркамасьветы РСФСР, ВОАПП, ВССП і Усераскамдрам абвешчаюць конкурс—спаборніцтва пісьменьнікаў, драматургаў, паэтаў, кампазытараў на стварэньне высока-мастацкіх твораў розных жанраў (рамансы, аповесьці, навэллы, вершы, апавяданьні, п'есы, опэрныя і музычныя творы). У конкурсе могуць прыняць удзел як вядомыя майстры літаратуры і мастацтва, так і маладыя аўтары, у прыватнасьці ўдарнікі, закліканыя ў літаратуру.

Вызначана 26 прэмій разьмерам ад 750 да 10.000 руб. Лепшы твор будзе ўзнагароджаны прэміяй імя Кастрычніцкай рэвалюцыі ў разьмеры 25.000 руб. УсеЦСПС, Наркамасьветы, ВОАПП і Усераскамдрам зьвярнуліся з заклікам да адпаведных арганізацый саюзных рэспублік арганізаваць конкурс—спаборніцтва на стварэньне твораў нацыянальнай літаратуры і мастацтва.

Магнітагорскі камбінат

На здымку: агульны выгляд мантажыруемых мартэнаўскіх пячэй

ЗАМЯЖОЮ

Шанхай пад градам снарадаў

ШАНХАЙ. 16-II. Высадка японская войска і вайсковых матар'ялаў ня спынялася на працягу ўчарайшага і сёньняшняга дзён. Прыбыло каля 2-х дывізій, якія неадкладна накіраваны на розныя вучасткі Чапэй-Усунскага фронту. Фронт фактычна цягнецца суцэльнай лініяй ад Чапэю да Усуну. Па ўсёй лініі фронту ўстанаўляюцца гарматы, будуюцца кулямётныя гнёзды, падвозяцца танкі. Ня гледзячы на завярэньні японскай улады, што яна мае намер мірным шляхам вырашыць пытаньне аб адводзе кітайскага войска, ідзе няўхільная цяжкая і доўгая барацьба.

Кітайскае войска працягвае ўмацоўваць свае пазіцыі, абводзіць стратэгічныя пункты дротавымі загародамі. Галоўнакамандуючы 19-ай кантонскай арміі Цай-Цін-Кай заявіў, што кітайскае войска гатова абараняць пазіцыі да апошняга часавека і ня думае адступаць.

Хваля ўзброенай барацьбы з японскімі імпэрыялістамі ўзрастае

ШАНХАЙ. 15-II. Кітайская ваенная ўлада Нанкіну абвяргае абвінавачаньні выходзячыя з японскага ваеннага міністэрства, накіраваныя супроць 19-й кантонскай арміі. У заяве заначаецца, што армія бьецца з японцамі, у мэтах самаабароны, паводле загаду ўраду, што армія зьяўляецца адной з самых лепшых частак кітайскага войска, добра абмундыравана, дысцыплінавана і не знаходзіцца пад уплывам якой небудзь палітычнай клікі.

ШАНХАЙ. 14-II. Нанкінскае агенцтва «Го-Мінь» паведамляе, што супраціўленьне 19-й кантонскай арміі выклікала ўздым сярод кітайскіх валанцёраў. Вялікая колькасьць насельніцтва ў Манчжурыі далучаецца да салдатаў і валанцёрскіх атрадаў, якія аб'ядноўваюцца ў 21-ю армію, налічваючую каля 200.000 чал.

ШАНХАЙ. 16-II. У многіх гарадох Кітаю наглядаецца значны рост розных валанцёрскіх арганізацый, груп абароны і г. д., якія ставяць сябе мэтаю дапамагчы 19-й арміі ў яе барацьбе супроць японцаў. Гэты рух прыняў шырокія разьмеры.

Жанчыны арганізуюць па ўсёй краіне грашовыя эборы, ва ўнівэрсытэтах арганізуюцца трупы сясьцёр міласэрдзьдзя, грамадзянскія арганізацыі ўзбройваюцца для падтрыманьня ўзброенага супраціўленьня.

ШАНХАЙ. 15-II. У Нанкіне арганізавана 3 корпусы «жалеза і крыві», якія накіроўваюцца ў Шанхай для паступленьня ў рады 19-й кантонскай арміі. (19-ая кантонская армія б'ецца з японцамі на фронце Шанхай-Усун).

* *

ТОКІЕ. 16-II. Паводле паведамленьня агенцтва Сімбун Рэнго з Шанхаю, кітайскае войска ўчора абстраляла высадзіўшыхся японскіх салдат.

Японскі дэсант 14 лютага страціў 80 чалавек забітымі і 450 параненымі.

Кітай рыхтуецца да абароны Нанкіну

ШАНХАЙ. 16-II. Агенцтва «Юнайтэд Прэс» паведамляе, што спробы японскага войска акупаваць Нанкін сустракаюць упартае супраціўленьне з боку кітайскага войска. Кітайскае войска прымае ўсе неабходныя меры абароны.

Створаны 3 лініі абароны. Гарматы ўстанаўліваюцца на гарадзкіх сьценах і верхавінах узгоркаў. Форты, размешчаныя на «львіных узгорках», абкружаюцца барыкадамі і дротавымі загародамі. Значныя вайсковыя сілы прыведзены ў баявую гатоўнасьць. У горадзе магазыны закрыты, дзелавое жыцьцё замерла. Усходы кідаюцца ў вочы галодныя мужчыны і жанчыны з дзецьмі. Нясупынным струменем цягнуцца ўцекачы і хутка расьце беспрацоўе.

За дымавой заслонай жэнэўскай гаварыльні

ФРАНЦЫЯ УЗМОЦНЕНА РЫХТУЕЦЦА ДА ВАЙНЫ

ПАРЫЖ, 16-II. «Юманітэ» падае паведамленьні рабкораў аб тым, што ў Францыі вядуцца ўзмоцненыя ваенныя падрыхтоўкі.

Згодна гэтых паведамленьняў, на аўтамабільных заводах Рэно выпрацоўваюцца дызэлі магутнасьцю ў 25 конскіх сіл для суднаў ваенна-морскага флёту і танкаў.

Узмоцненая выпрацоўка ўзбраеньняў і рознага роду матар'ялаў па заказах вайсковага ведамства мае месца ў Пюто, Шайон-Су-Баны, Мэлен, Ман, В'ерзон, Шатодэн і іншыя.

Адст ўка французкага ўраду

ПАРЫЖ 17-II. Агэнцтва Гавас паведамляе, што прэзыдэнт Думэр прыняў адстаўку габінэту Ляваля.

Сёньня-ж ўвечары Думэр пачаў перагаворы з лідэрамі палітычных партый аб вырашэньні ўрадавага крызісу.

Далей ў паведамленьні агэнцтва гаворыцца: «У адказ на запытаньне журналістаў

Лясная эстафэта

Заняць перадавое месца ў лесавывазцы

МОЖНА: праз разгортваньне сацыялістычных мэтадаў працы, праз мабілізацыю на вывазку ўсіх калгасаў, беднякоў і серадняковў-аднаасобнікаў, пры ўмове добрага апэрацыйнага кіраўніцтва з боку парт'ячэек

Множыць перадавыя прыклады

(Ад нашага бабруйскага карэспандэнта)

Ня гледзячы на рад дырэктыў аб умацаваньні загатовак і вывазкі лесу, ня гледзячы на апошнюю дырэктыву ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб фарсаваньні тэмпаў лесавывазкі, гэтая работа па Бабруйскім лесграмгасе ў на сёньняшні дзень ганебна адстае. Па загатоўках дзелавой сыравіны квартальны плян выкананы толькі на 30 проц., па дровах—на 38 проц. Па вывазцы дзелавой сыравіны квартальны плян выкананы на 10 проц. і па дровах—на 21 проц.

Прычынай гэтых ганебных прарываў зьяўляецца тое, што апарат лесграмгасу не перабудаваў сваёй работы, не паставіў у цэнтр сваёй увагі ажыцьцяўленьне 6 гістарычных паказаньняў т. Сталіна, не праводзіць арганізацыйнай работы па мабілізацыі мас на выкананьне пляну лесазагатовак і лесавывазак.

Зьлесьлічына ў практыцы лесазагатовак ня ўжываецца. Яўна недаацэньваецца брыгадны мэтад работы. Адсутнічае кулымасавая работа, надзвычайна слаба працуе каапэрацыя па наладжваньні грамадзкага харчаваньня і забесьпячэньня.

Выклік перадавых пажасьнікаў калгасу «Ясная раніца» ўсклаканаў працоўныя масы Бабруйшчыны. Калгасьнікі і аднаасобнікі беднякі і сераднякі адказваюць на выклік практычнымі мерапрыемствамі па ўзмацненьні вывазкі лесу. Так, Казулічкі сельсавет узяў на сябе абавязак даць 300 падвод у агульна-раённы чырвоны абоз з экспартнай сыравінай. Кожны з членаў гэтага сельсавету ўзяў абавязацельства завербаваць ня менш 10 падвод.

У сваю чаргу Любоніцкі сельсавет высунуў сустрэчную лічбу вывазкі, даўшы замест 22 тыс. кб. мэтраў—37 тыс. кб. мэтр. Ён абавязаўся ўдзельнічаць з 400 падводамі ў агульна-раённым абозе па вывазцы лесу.

Сустрэчны плян вывазкі лесу дала і вёска Любонічы ў колькасьці 2 тыс. куб. мэтр. Беднякі і сераднякі гэтай вёскі выклікалі на спаборніцтва іншыя вёскі сельсавету і ўзялі на буксір адстаючую вёску Морхавічы. Асобныя брыгады лесавозаў разгортваюць спаборніцтва паміж сабой. Брыгада Юркі Міхалапа абавязалася выканаць свой плян да 5 сакавіка.

На заклік калгасу «Ясная раніца» калгасы і бядняцка-серадняцкая частка аднаасобнікаў адказалі практычным разгортваньнем работы па лесавывазцы. Калгас імя 3 зьезду саветаў узяўся вывезьці 3 тыс. куб. мэтраў і выклікаў па спаборніцтва астатнія калгасы. Вёскі Казулічы і Слабодка ўзялі абавязацельствы датэрмінова выканаць плян вывазкі.

Ініцыятыва перадавых калгасаў Бабруйскага раёну павінна быць пад хопленa ўсімі калгасамі і аднаасобным бядняцка-серадняцкім сялянствам усёй Бабруйшчыны. Плян загатовак і вывазкі лесу павінен быць выкананы і перавыкананы.

А. Дамброўскі.

І матар'ялы, і дровы ня вывозяцца

Выкананьне лесазагатовак па Жлобінскім раёне зрываецца. Квартальнае заданьне па загатоўцы будаўнічых матар'ялаў у колькасьці 11.890 кбм. выканана толькі на 49,5 проц., а па вывазцы—ўсяго на 15,3.

Гэтыя лічбы сыгналізуюць аб тым, што паасобныя раённыя арганізацыі (лесграмгас, райграфсавет), асобныя парт'ячэйкі і сельсаветы (Затовскі, Кароткаўскі, Бабоўскі і Майскі) недаацэньваюць важнейшую гаспадарча-палітычную кампанію лесазагатоўкі.

Ніводная з вышэйпаказаных арганізацый не надала гэтай кампаніі масавага характару, не ўзьняла гэту справу на належную палітычную вышыню.

Асобныя сельсаветы ня далі цьвёрдых заданьняў кулацка-заможнай частцы, а калі і далі, дык ня робяць кравёркі, як гэтыя цьвёрдыя заданьні выконваюцца.

Да гэтага часу сельсаветы не прыцягнулі да адміністрацыйна-судовай адказнасьці ніводнага кулацкага двара, які зрывае лесазагатоўкі. У сельсаветах адсутнічае ўсякі ўлік выкананьня лесазагатовак па паасобных вёсках сельсавету.

Ні чым іншым, як коснасьцю можна назваць тое зьявішча, калі працаўнікі Жлобінскага аддзяленьня лесграмгасу не вядуць уліку выкананьня лесазагатовак па паасобных сельсаветах.

Адсутнасьць уліку выкананьня лесазагатовак у лесграмгасе рахункавод Бараноўскі тлумачыць тым, што «вельмі цяжка зрабіць гэты ўлік».

Жлобінскае аддзяленьне лесграмгасу абмежавалася давядзеньнем пляну па лесазагатоўках і лесавывазках да паасобных сельсаветаў, як вы конваюцца гэтыя пляны сельсаветамі—лесграмгас не правярае.

Нельга не адзначыць і тое, што ад дзяленьне лесграмгасу мае вялікую грашовую запазычанасьць рабочым-возчыкам лесаматар'ялаў.

Гэтае зьявішча Жлобінскае аддзяленьне Рагачаўскага лесграмгасу тлумачыць тым, што Рагачэўскі лесграмгас не дае крэдыту для выплаты зарплаты рабочым.

Ня лепш абстаіць справа з загатоўкай і вывазкай дроў па раёне. Плян па загатоўках выкананы толькі на 27,7 проц., а па вывазцы—26,9 проц.

Забясьпечыць пасьпяховае выкананьне пляну лесазагатовак магчыма толькі праз шырокае разгортваньне арганізацыйна-масавай работы, праз спаборніцтва і ўдарніцтва, праз штодзённае растлумачэньне калгасьнікам і бядняцка-серадняцкім масам вялізарнага значэньня своячасовага і поўнага выкананьня пляну лесазагатовак.

Адказнейшая задача парт'ячэек—мабілізаваць калгасы, бядняцка-серадняцкія масы на хутчэйшае і безадкладнае выкананьне лесазагатовак і асабліва лесавывазак.

Неабходна на гэту справу мабілізаваць увесь актыў сельсаветаў і калгасаў, камсамольскіх і прафэсыянальных арганізацый раёну.

Выкананьне лесазагатовак—важнейшая задача партарганізацыі раёну.

Закрэўскі.

Суботнік па вывазцы лесу

ПОЛАЦАК. (Наш кар.). На шляху Сосьніцкага сельсавету былі абгавораны пытаньні лясной эстафэты. Сельсавет уключыўся ў эстафэту і прыняў рад канкрэтных мерапрыемстваў.

Арганізаваны штаб садзейнічаньня лясной эстафэце. Выдзелены вярбоўшчыкі па калгасах і вёсках для заключэньня дагавораў на рабочую сілу.

Членам сельсавету даручана праверыць выкананьне заданьня кулакаваможнымі гаспадаркамі. Да вучлесграмгасу прымацаваны 85 падвод ад калгаснага сэктару і 65 ад аднаасобнага.

На Барысаглебскім і Прарабскім лесасучастках 26 сьнежня быў арганізаваны масавы суботнік па дровавывазцы. У суботніку ўдзельнічала 220 падвод, рабочыя лясного вучастку, калгасьнікі і аднаасобнікі—беднякі і сераднякі. Вывезена 167 раўмэтраў дроў, за якія зароблена 656 руб. Заробленыя ад суботніку грошы перададзены ў фонд індустрыялізацыі краіны.

Удзельнікі суботніку выклікалі пасьледаваць іх прыкладу **Гомельскі, Экімансні і Палатоўскі прарабскія вучасткі.**

Я. Зорны.

Клеймяць экспартную дрэвясину

Лесавывазка недаацэньваецца

Слуцак. Паасобныя парт'ячэйкі і сельсаветы Слуцкага раёну не даацэньваюць справы лесавывазкі, зрываюць правядзеньне гэтага мерапрыемства. Тое-ж самае робяць РВК, Райкалгасаюз і Лесграмгас.

Таму плян загатовак будаўнічага лесаматар'ялу выкананы ўсяго на 15,8 проц.,—дроў—на 40 проц. Плян вывазкі дроў—на 20,2 проц.

Сельсаветы, як Даросінскі, Ісэрскі, Мусіцкі, Цараўскі, Вял.-Сыліўскі і інш. злачынна зрываюць правядзень не вывазкі. Кулацка-заможныя гаспадаркі па цэлым радзе сельсаветаў вывезьлі толькі па адным куб. мэтры, а сельсаветы на гата глядзяць скрозь пальцы, ня прымаюць ніякіх мер. Вось гэтыя сельсаветы: Шышчыцкі, Грэскі, Полікарпаўскі і інш.

Райштаб пры РВК працуе слаба. Зводкі па ходзе кампаніі, якія райштаб дасылае РВК, застаюцца без фуху.

Трэба рашуча ўзяцца за работу.

Алесь Шлакоўскі.

Фінпаход

Ударныя брыгады—кожнаму вучастку фінпляну

Заваяваць перамогу

Плян першага кварталу на 10 лютага выкананы толькі ўсяго на 39,3 проц. Рад раёнаў, якія ў апошніх кварталах 1931 г. па бальшавіцку змагаліся за выкананьне фінансавага пляну, у першым квартале гэтага году спынілі сваю дзейнасьць, у выніку чаго ў выкананьні фінпляну апынуліся ў глыбокім тыле Менскі, Віцебскі, Заслаўскі і інш.).

У тых раёнах, дзе сапраўды зразумелі важнасьць своячасовага і поўнага выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў, дзе зразумелі лёзунг правадыра камуністычнай партыі і рабочай клясы тав. Сталіна, што «сутнасьць бальшавіцкага наступленьня состаіць далей у тым, каб мабілізаваць максымум сродкаў на справу фінансаваньня нашай індустрыі, нашых калгасаў і саўгасаў», якія шырока разгарнулі і на справе ўжывалі сацыялістычныя мэтады работы—сацспаборніцтва і ўдарніцтва, дзе сьвядома падыйшлі да пытаньня, што без мабілізацыі ўвагі савецкай грамадзкасьці немагчыма выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў, апошнія дабіліся бліскучых посьпехаў на фінансавым фронце. Так, напрыклад, Тураўскі раён на 10 лютага плян першага кварталу выканаў на 67 проц., Мазырскі—65,2 проц., Старобінскі—62,5 проц. і Чачэрскі—56 проц.

На сёньняшні дзень прыходзіцца сыгналізаваць, што ўсе астатнія раёны не дабіліся належных вынікаў у выкананьні фінансавага пляну і трэба лічыць, што калі будуць працаваць надалей як зараз, то фінансавы плян першага кварталу ня будзе выкананы да 15 сакавіка.

Асабліва ганебна адстаюць наступныя раёны: Лельчыцкі, які плян выканаў толькі ўсяго на 16 проц., Бялыніцкі—19,7 проц., Расонскі—20,8 проц., Нараўлянскі—23,2 проц., Камарынскі—23,8 проц., Гарадоцкі—24,6 проц., Вушацкі—24,8 проц., Жлобінскі—25,2 проц., Стара-Дарожскі—25,5 проц., Койданаўскі—26,3 проц., Талочынскі—26,9 проц., Лёзьнянскі—27,6 проц., Шклоўскі—27 проц., Уваравіцкі—28 проц. і інш.

Фінансавы фронт патрабуе ўдарных тэмпаў асабліва зараз, калі мы ўступілі ў апошні заключны год пяцігодкі. Усе партыйныя, фінансавыя, гаспадарчыя, прафсаюзныя і іншыя арганізацыі павінны неадкладна арганізаваць сваю работу так, каб яна забясьпечыла пасьпяховае выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў да 15 сакавіка.

Трэба мабілізаваць на выкананьне фінансавага пляну ўсю савецкую грамадзкасьць, арганізаваць і замацаваць сталы фінансавы актыў, які штодзённа займаўся-б справай мабілізацыі сродкаў.

Сацыяльна-грамадзкая праверка выкананьня фінпляну, якая зараз праводзіцца ў Менску павінна быць арганізавана ва ўсіх гарадох і раёнах. Фінансавы паход павінен быць узьняты на вышэйшую ступень. На аснове шырокага разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва, павінна быць заваёвана перамога на фінансавым фронце ў першым квартале заключнага году пяцігодкі.

Ліквідаваць запазычанасьць па пазыцы

Ворша. (Наш кар.). Па раёне на 10 лютага плян мабілізацыі сродкаў першага кварталу выкананы толькі ўсяго на 35,9 проц. Па цэлым радзе плацяжоў наглядаецца зьлікая запазычанасьць. Па пазыцы 3-ці рашаючы запазычанасьць складае па горадзе каля 160.000 руб. і па вёсцы 140.000 руб. Асабліва вялікая запазычанасьць ёсьць у 3-м экспэдыцыйным раёне МТБ чыгункі, дзе ня ўнесена ўзносаў за аб лігацыі звыш 6.000 руб., 4-м будаўнічым вучасткам—звыш 8.000 руб., ТСТ—3.282 р., заводам Чырвоны Кастрычнік—5.807 руб., Лёнкамбінатам—2.894 руб., аўтаколай—215 руб. і г. д. Па многіх прадпрыемствах рабочыя яшчэ ня поўнасьцю ахоплены падпіскай на пазыку як, напрыклад, па мясакамбінату і інш.

Вялікая запазычанасьць наглядаецца з прычыны бязьдзейнасьці камсодаў. У большасьці прадпрыемстваў і ўстаноў камсоды не работаюць. Напрыклад, не работае камсод на мясакамбінаце 2-й прыгараднай гаспадаркі, 14-м вучастку Белсельбуду і г. д.

Дэкадзнік агляду работы камсодаў на павінен у райне ажывіць работу камсодаў. У самы бліжэйшы час трэба ліквідаваць запазычанасьць па дабрахвотных плацяжох. У часе агляду трэба вынявіць і прэм'яваць добрыя камсоды. Дрэнныя камсоды павінны быць прыцягнуты да адказнасьці па грамадзкай, прафсаюзнай ці партыйнай лініі.

Аршанщчына мае ўсе падставы для пасьпяховага і датэрміновага выкананьня фінпляну першага кварталу. Для гэтага патрэбна толькі мабілізаваць усю савецкую грамадзкасьць на гэты вучастак работы.

Калюжны.

Пастанова XIV зьезду КП(б)Б па справаздачы ЦКК-РСІ БССР

Заслухаўшы справаздачны даклад т. Калініна аб рабоце ЦКК КП(б)Б з XIII зьезду КП(б)Б, XIV зьезд КП(б)Б прызнае палітычную лінію ЦКК правільнай і праведзеную работу здаваль няючай.

I

XIV зьезд КП(б)Б са здавальненьнем адзначае, што ЦКК з усёй бальшавіцкай настойлівасьцю і рашучасьцю вяла змаганьне за няўхільнае ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, ахоўваючы ленінскае адзінства КП(б)Б у бязьлітнай барацьбе з правым апартунізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, які выявіўся: ў нежаданьні ў радзе выпадкаў змагацца на справе за бальшавіцкія тэмпы і якасьць работы, у патураньні кулаку, у адсутнасьці актыўнай барацьбы за рэалізацыю 6 умоў т. Сталіна, у буржуазна-рвацкіх тэндэнцыях на паасобных прадпрыемствах, у радзе саўгасаў і калгасаў і паасобных зьвеньнях цэнтральнага апарату, у радзе фактаў «очкаўцірацельства», у спробах паасобных работнікаў скарачэньня рэальныя вытворчыя, пасеўныя, загатоўчыя пляны і інш. У той-жа час ЦКК вяла барацьбу з уселякімі «левымі» апартуністычнымі скажэньнямі партыйнай лініі ў практычнай дзейнасьці, якія выявіліся ў радзе месц ў падмене палітычна-масавай работы на вёсцы грубым адміністраваньнем, у парушэньні дабраахвотнасьці пры калектывізацыі, у дачы цьвёрдых заданьняў серадняцкім гаспадаркам, у дапушчэньні перагібаў пры муніцыпалізацыі дамоў, асабліва ў мястэчках. Гэтыя скажэньні давалі магчымасьць апартуністычным, контр-рэвалюцыйным і кулацкім элемэнтам скарыстоўваць «левацкія» перагібы і бясчынствы ў адносінах да серадняка і бедняка для агітацыі супроць сацыялістычнага будаўніцтва (Лельчыцы і інш.).

ЦКК ачышчала рады партыі ад рэштак трацкісцкіх контр-рэвалюцыянэраў (Кантаровіч, Пагосткін і інш.), вяла змаганьне з трацкісцкай кантрабандай і гнілым лібэралізмам, прымірэнцтвам, выганяючы з радоў партыі дву рушнікаў, якія фармальна галасуюць за лінію партыі, а на справе яе не праводзяць, ачышчаючы партыю ад тых «камуністых», якія па чыноўніцку, бюрократычна-бяздушна адносяцца да справы сацыялістычнага будаўніцтва, да патрэб рабочае клясы і шырокіх мас працоўных.

XIV зьезд КП(б)Б ухваляе праведзеную работу ЦКК па барацьбе за ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі. Канцэнтруючы асноўны агонь на вялікадзяржаўным шавінізьме, як галоўнай небясьпецы на даным этапе, наносячы руйнуючы ўдар па яго канкрэтных носьбітах як у тэорыі, так і на практыцы, ЦКК у той-жа час правяла вялікую работу па выкрыцьці і барацьбе з контр-рэвалюцыйным беларускім нацыянал-дэмакратызмам, па ачыстцы КП(б)Б ад агентуры нацдэмакратызму ў радах партыі, разаблачыўшы іх буржуазна-нацыяналістычны, здрадніцкі твар перад партыйнымі і рабочымі масамі. ЦКК таксама рашуча змагалася з праявамі яўрэйскага і інш. колераў шавінізму, з антысэмітызмам.

II

Ажыцьцяўляючы пасьлядоўны кантроль за выкананьнем дырэктыў партыі і ўраду на асноўных вучастках гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, мабілізуючы актыўнасьць рабочых і калгасных мас, ЦКК-РСІ правяла вялізарную работу па забесьпячэньні тэмпаў разгорнутага сацыялістычнага наступленьня, па перамаганьні няжыццяй сацыялістычнага росту, па зламленьні супраціўленьня кдясавага ворага і яго апартуністычнай агентуры ўнутры партыі, чым садзейнічала буйнейшым посьпехам КП(б)Б у сацыялістычным будаўніцтве.

ЦКК-РСІ у сваёй рабоце канцэнтравала ўвагу на рашаючых вучастках народнай гаспадаркі. Змагалася за выкананьне прамфінпляну, за ўмацаваньне энэргетычна-апалавай і сыравінай базы прамысловасьці, за вытворчасьць новых будматар'ялаў і падвышэньне эфэктыўнасьці капітала-ўкладаньняў, за перабудову чыгуначнага, воднага, дарожнага транспарту, за арганізацыйна-гаспадарчае умацаваньне калгасаў, за разьвіцьцё сацыялістычнай жывёлагадоўлі, лёну і інш. тэхнічных культур.

ЦКК-РСІ ажыцьцяўляла кантроль за выкананьнем дырэктыў партыі і ўраду па палепшаньні матар'яльна-бытавых і культурных умоў рабочых і калгасных мас, дамагаючыся перабудовы работы каапэрацыі, палепшаньня рабочага снабжэньня і грамадзкага харчаваньня, пашырэньня і рэканструкцыі камунальнага будаўніцтва.

XIV Зьезд КП(б)Б адзначае, што ЦКК-РСІ правяла вялікую работу па далейшым разгортваньні пралетарскай самакрытыкі, як аднаго з важнейшых мэтадаў выхаваньня партыйных радоў рабочых і працоўных мас- як лепшага сродку ўзмацненьня сувязі партыі з масамі, выпраўленьня недахопаў у рабоце, зьнішчэньня і папярэджаньня ўсялякіх апартуністычных скажэньняў партыйнай лініі.

Зьезд ухваляе праведзеную ЦКК-РСІ работу па барацьбе з апартуністычнымі адносінамі да самакрытыкі, зацыкам, ігнараваньнем і скажэньнямі бальшавіцкай самакрытыкі ўнутры партыйнай дэмакратыі (Віцебская, Барысаўская, Буда-Кашалёўская і інш. справы).—На аснове правядзеньня пралетарскай самакрытыкі і нябывалага росту палітычнай актыўнасьці і творчай ініцыятывы рабочых і калгасных мас узрасла арганізатарская роля органаў КК-РСІ па мабілізацыі мас у разгорнутае наступленьне на бюрократызм, па ўзмацненьні масавага пралетарскага кантролю над работай дзяржаўнага апарату (шэфства, сац. сумяшчэньне), па ачыстцы апарату ад кляса-варожых, бюракратычных і апартуністычных элемэнтаў, па арганізацыі сыстэматычнай праверкі выкананьня ў савецкім апараце дырэктыў партыі і ўраду, чым дасягнута палепшаньне складу і работы ўсяго дзяржаўнага апарату.

III

Зьезд даручае ЦКК і яе мясцовым органам і надалей з бальшавіцкай рашучасьцю ахоўваць ленінскае адзінства партыі, што зьяўляецца галоўнай умовай для пасьпяховага будаўніцтва сацыялізму, яшчэ больш узмацніць барацьбу з правым апартунізмам, найбольш небясьпечным на даным этапе, з «левым» апартунізмам, рэшткамі контр-рэвалюцыйнага трацкізму і яго кантрабанды, гнілым лібэралізмам і прымірэнцтвам да ўсялякіх адхіленьняў ад генэральнай лініі партыі.

ЦКК павінна з усёй пільнасьцю змагацца за ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі супроць ўхілу вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць ўхілаў у бок беларускага шавінізму і рэшткаў контр-рэвалюцыйнага беларускага нацыянал-дэмакратызму, супроць яўрэйскага і інш. колераў шавінізму з антысэмітызмам і з нацыянал-апартунізмам ва ўсіх яго разнавіднасьцях, дамагаючыся ўсямернага ўзмацненьня інтэрнацыянальнага выхаваньня працоўных мас.

Зьезд зьвяртае ўвагу ЦКК-РСІ, што ў змаганьні за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі **органы КК-РСІ павінны ацэньваць камуніста, які працуе на любым вучастку, выходзячы з таго, як ён на справе, а не на словах змагаецца за шэсьць гістарычных умоў т. Сталіна, за прамфінплян, за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, за ажыцьцяўленьне цэнтральнай задачы выкананьня пяцігодкі ў чатыры гады і стварэньня тым самым неабходных прадпасылак для ажыцьцяўленьня другой пяцігодкі—пабудовы сацыялізму.**

Цэнтральнай гаспадарча-палітычнай задачай ЦКК-РСІ ў змаганьні за тэмпы і якасьць сацыялістычнага будаўніцтва зьяўляецца мабілізацыя ўсіх рэсурсаў краіны, жорсткая барацьба са стратамі, з непрадукцыйнымі выдаткамі, забесьпячэньне поўнага і максымальна-эфэктыўнага скарыстаньня матар'яльных рэсурсаў і людзкіх сіл на прадпрыемстве, транспарце, саўгасе, калгасе і г. д.

Органы КК-РСІ павінны забясьпечыць глыбокае ўкараненьне прынцыпаў гаспадарчага разьліку і кантролю рублём ва ўсе вучасткі народнай распадаркі, без чаго немагчыма бальшавіцкае змаганьне за новыя крыніцы накапленьня, падвышэньне тэмпаў і якасьці работы.

Змагаючыся за кантроль рублём, за ўмацаваньне дагаворнай дысцыпліны, органы КК-РСІ павінны адначасова вытрушіць з практыкі работы ўстановы, прадпрыемства, калгасу, саўгасу буржуазныя скажэньні прынцыпаў гаспадарчага разьліку, буржуазна-рвацкія тэндэнцыі, разбазарваньне дзяржаўных рэсурсаў.

Зьезд патрабуе ад органаў КК-РСІ рашучай барацьбы за падвышэньне якасьці прадукцыі, што зьяўляецца адным з важнейшых гаспадарча-палітычных задач, за зьнижэньне сабекошту прамысловай і сельска-гаспадарчай прадукцыі. З ігнараваньнем задачы падвышэньня якасьці прадукцыі і выкананьня якасных пэказчыкаў пляну, гаспадарчага разьліку, з бюракратызмам і коснасьцю ў справе мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў і павялічэньня вытворчых магчымасьцяй прамысловасьці, транспарту, сельскай гаспадаркі, з супраціўленьнем рацыяналізацыі вытворчасьці—органы КК-РСІ павінны змагацца, як з горшым відам апартунізму.

IV

У барацьбе за індустрыялізацыю БССР ЦКК-РСІ канцэнтраваць і ў далейшым асноўную сваю ўвагу на праверцы выкананьня пастаноў XIV-га зьезду КП(б)Б па ўмацаваньні энэргетычна-апалавай базы, па стварэньні рэзкага пералому ў рабоце тарфяной прамысловасьці, па пашырэньні вытворчасьці новых будматар'ялаў і разгортваньні хімічнай і інш. відаў прамысловасьці, на аснове скарыстаньня мясцовай-мінэральнай, сельска-гаспадарчай і лясной сыравіны. Разам з гэтым зьезд даручае ЦКК-РСІ сачыць за далейшым разьвіцьцём прамысловасьці на прывознай транспартабельнай сыравіне.

ЦКК-РСІ павінна ўзмацніць свой кантроль за выкананьнем дырэктыў партыі па мэханізацыі працаёмкіх працэсаў вытворчасьці, у першую чаргу па тарфяной, лясной, будаўнічай і керамічнай прамысловасьці, мэханізацыі рашаючых вучасткаў сельска-гаспадарчай вытворчасьці, па падпарадкаваньні разьвіцьця мэталёпрамысловасьці гэтай ня асноўнай задачы, арганізаваўшы пасьлядоўны кантроль за поўным і найбольш эфэктыўным скарыстаньнем мэханізмаў.

Зьезд лічыць, што аднэй з важнейшых задач усёй партыі і органаў КК-РСІ зьяўляецца барацьба за максымальную эфэктыўнасьць капіталаўкладаньняў, паскораньне тэмпаў будаўніцтва і ўпарадкаваньне яго, за хуткае асваеньне тэхнікі вытворчасьці новых прадпрыемстваў і падрыхтоўкі кадраў для іх. Органы КК-РСІ павінны забясьпечыць пільны кантроль за выкананьнем буджэтнага пляну і вызначаных тэрмінаў, у першую чаргу па вядучых галінах і аб'ектах, за выкананьнем дырэктыў партыі па тэхнічнай рэканструкцыі будаўнічай вытворчасьці па зьнішчэньні фактаў бесплянавасьці, безгаспадарчасьці ў арганізацыі будаўнічай вытворчасьці, за правільным мэтавым разьмеркаваньнем будматар'ялаў і рацыянальным іх скарыстаньнем, настойліва дамагаючыся больш рашучага і сьмелага пераходу на стандартнае будаўніцтва, на карыстаньне новымі будматар'ялямі, патаненьня і карэннага палепшаньня якасьці будаўніцтва.

ЦКК-РСІ павінна пільна сачыць за перабудовай работы на транспарце, змагаючыся з супраціўленьнем апартуністычных і бюрократычных элемэнтаў спаранай язьдзе, ліквідацыі абязьлічкі паравозу і вагону, укараненьню гаспадарчага разьліку ва ўсіх зьвеньнях транспарту, забясьпечваючы сацыялістычную рэканструкцыю транспарту, палепшаньне работы станцый і дэпо, мабілізацыю ўнутраных рэзэрваў транспарту, ў першую чаргу падвышанае скарыстаньне рухомага саставу.

КК-РСІ павінны прыняць рашучыя захады па дысцыплінаваньні клієнтуры транспартных арганізацый, па барацьбе з сустрэчнымі перавозкамі, па ўзмоцненым карыстаньні рачным транспартам.

ЦКК-РСІ зьвярнуць асабліва сур'ёзную ўвагу на разьвіцьцё і максымальна - эфэктыўнае выкарыстаньне рачнога транспарту, на выкананьне пляну і карэннае палепшаньне дарожнага будаўніцтва, (як шасэйнага, так і мясцовага).

V

У галіне далейшай сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі органы КК-РСІ павінны ўзмацніць сваю ўвагу на пытаньнях арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў і ўздыму вядучай ролі МТС і саўгасаў як прадпрыемстваў пасьлядоўна - сацыялістычнага тыпу на вёсцы. Зьезд прапануе ЦКК - РСІ паставіць у цэнтры ўвагі разгортваньне жывёлагадоўлі і тэхнічных культур, рашучую барацьбу са стратамі, безгаспадарчасьцю, асабліва ў гэтых вядучых галінах сельскай гаспадаркі БССР. ЦКК-РСІ і яе органы на мясцох павінны весьці неаслабную барацьбу за ўздым прадукцыйнасьці працы ў калгасах і саўгасах, за падвышэньне таварнасьці, ураджайнасьці палей, прадукцыйнасьці жывёлагадоўлі, за разгортваньне МТФ, СТФ і сацыялістычнай арганізацыі працы ў іх, за вытручваньне буржуазна-рвацкіх тэндэнцый у іх асяродзьдзі, за выхаваньне з калгасьніка сапраўднага ўдарніка сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. КК-РСІ павінны ўстанавіць асабліва кантроль за арганізацыяй працы, за ліквідацыю абязьлічкі і кулацкай ураўнілаўкі ў калгасах, даючы руйнуючы адпор спробам кулацкіх элемэнтаў і іх агентуры разбурыць калгасы з сярэдзіны. Першачарговай задачай органаў КК-РСІ павінна стаць ажыцьцяўленьне пільнага кантролю за падрыхтоўкай і правядзеньнем трэцяй бальшавіцкай сяўбы, пашырэньнем за сеўнай плошчы, асабліва тэхнічных культур і ўзмацненьне кармавой базы для сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Зьезд падкрэсьлівае, што ўсе гэтыя задачы сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі патрабуюць ад органаў КК-РСІ пільнага кантролю за правільным правядзеньнем усімі партыйнымі, савецкімі, зямельнымі, калгаснымі арганізацыямі генэральнай лініі партыі, у прыватнасьці, рашэньняў ЦК УсеКП(б) ад 2-VIII 1931 г. і лістападаўскага аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б па ажыцьцяўленьні суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі на яе аснове кулацтва як кляса.

VI

Зьезд патрабуе ад органаў КК-РСІ прадаўжэньня і надалей жорсткай барацьбы за палепшаньне работы каапэрацыі па абслугоўваньні ёю рабочых і калгасных мас. ЦКК-РСІ павінна пільна сачыць за тым, каб каапэрацыйныя арганізацыі баявымі тэмпамі разгарнулі савецкі гандаль, самадзейнасьць, самазагатоўкі, сьвінаадкорм і рэзка палепшылі-б работу сталовак, прыгарадных гаспадарак, змагаючыся з праявамі нэпманскага духу, з ігнараваньнем прынцыпаў гаспадарчага разьліку і савецкай палітыкі цэн, з замаражваньнем таваразвароту, з праявамі мэханічнага разьмеркаваньня тавараў і разбазарваньнем фондаў. ЦКК РСІ і яе органы на мясцох павінны самым рашучым чынам караць усіх тых, якія бюракратычна ігнаруюць патрэбы рабочага спажыўца і супраціўляюцца баявой перабудове каапэрацыі і дзяржаўнага гандлю.

Зьезд даручае ЦКК-РСІ ажыцьцяўляць сталы кантроль за выкананьнем дырэктыў чэрвеньскага пленуму ЦК УсеКП(б) аб камунальным будаўніцтве, у прыватнасьці, за рашэньнямі ЦК КП(б)Б аб гарадзкой гаспадарцы Менску.

VII

Пасьпяховае вырашэньне задач культурнай рэвалюцыі, далейшы рост культуры сацыялістычнай па сваім зьмесьце і нацыянальнай па сваёй форме, ператварэньне БССР у 1932 г. у краіну суцэльнай пісьменнасьці патрабуе ад ЦКК - РСІ ажыцьцяўляць няўхільна кантроль і весьці бальшавіцкае змаганьне за палепшаньне якасьці работ усяго нацыянальна - культурнага фронту, за марксысцка - ленінскі сьветапогляд ва ўсёй літаратурнай прадукцыі, за высока - якасную і ідэалёгічна - вытрыманую работу, пачатковай, сярэдняй і вышэйшай школы, яе палітэхнізацыю, за ўзмацненьне тэмпаў і карэннае палепшаньне якасьці падрыхтоўкі пралетарскіх кадраў. На носячы бязьлітасна ўдар па трацкісцкай, вялікадзяржаўнай, нацдэмаўскай і інш. буржуазнай кантрабандзе і гнілым лібэралізьме на фронце марксысцка - ленінскай тэорыі, неабходна дамагчыся падпарадкаваньня ўсёй культурнай работы, работы навукова - дасьледчых устаноў і інстытутаў непасрэдным задачам сацыялістычнага будаўніцтва, уздыму агульнага культурнага, палітычнага і тэхнічнага ўзроўню рабочых і працоўных мас, укараненьня тэхнікі ў масы, разьвіцьця сацыялістычна - сьвядомых адносін рабочых і калгасных мас да сацыялістычнай вытворчасьці і выхаваньня сьвядомага будаўніка сацыялістычнага грамадзтва.

VIII

Падкрэсьліваючы што ўсе тыя піганцкія задачы, якія пастаўлены партыяй перад рабочай клясай і працоўнымі ў 1932 г., у другой пяцігодцы могуць быць ажыцьцяўлены толькі пры ўмове перабудовы работы і кіраўніцтва партыйных, савецкіх, прафэсыянальных і гаспадарчых арганізацый па-новаму, зьезд лічыць, што асноўнай задачай КК-РСІ зьяўляецца забясьпячэньне бальшавіцкага ажыцьцяўленьня гэтай перабудовы на аснове 6-ці гістарычных паказаньняў правадыра партыі тав. Сталіна. Зьезд прапануе ЦКК-РСІ бязьлітасна змагацца з праявамі фармальнага, папяровага кіраўніцтва, з штампоўшчынай, дабіваючыся, каб кіраўніцтва гаспадарчых органаў было канкрэтным і апэрацыйным. Органы КК-РСІ пры праверцы работы таго ці іншага прадпрыемства ці ўстановы павінны змагацца за тое, каб кожны гаспадарнік ня толькі дакладна ведаў - бы агульнае становішча кожнага цэху, але і кіраваў - бы працэсамі вытворчасьці, авалодваючы тэхнікай, эканомікай; фінансамі заводу, фабрыкі, калгасу і саўгасу.

Асноўным зьместам работы органаў КК - РСІ па перабудове савецкага і гаспадарчага апарату па - новаму павінен стаць перавод работы ўсяго апарату на рэйкі праверкі выкананьня дырэктыў партыі і ўраду, што зьяўляецца цэнтральным зьвяном у перабудове работы апарату па - новаму. Зьезд прапануе ЦКК - РСІ ў бліжэйшы час забясьпечыць выпрацоўку сыстэматычнай праверкі выкананьня ва ўсім апараце зьнізу да верху.

Зьезд зьвяртае асабліву ўвагу органаў КК - РСІ на палепшаньне пастаноўкі плянаваньня і ўліку, як асноўных мэтадаў кіраўніцтва, без чаго немагчыма поўнае скарыстаньне пераваг савецкай гаспадаркі, арганізаванай на пачатках сацыялістычнай плянавасьці.

Зьезд прапануе ЦКК - РСІ дабіцца палепшаньня кіраўніцтва цэнтральнага апарату раёнамі, зрабіўшы яго канкрэтным, апэрацыйным, дапасаваным да спэцыялізацыі раёну, дамагаючыся з боку раёнаў умацаваньня кадрамі і карэннага палепшаньня кіраўніцтва і работы сельскіх саветаў. Даручыць ЦКК - РСІ ў бліжэйшы час канцэнтраваць увагу на перабудову апаратаў Дзяржпляну, Калгасцэнтру і Белкаапсаюзу.

Праводзячы далейшую сыстэматычную праверку работы апарату, ачыстку яго ад бюракратычных, клясава-варожых і апартуністычных элемэнтаў, ЦКК - РСІ павінна забясьпечыць самае шырокае прыцягненьне працоўных да работы апарату. Зьезд абавязвае партыйныя, савецкія; прафэсыянальныя і камсамольскія арганізацыі забясьпечыць рашучы пералом у пастаноўцы шэфскай работы прадпрыемстваў над установамі, у больш шырокім распаўсюджваньні апраўдаўшых на практыцы мэтадаў сацыялістычнага сумяшчэньня.

Канстатуючы рад гр

Пастанова Савету Працы і Абароны

пра кантрактацыю лёну і канапель ураджаю 1932 году

14 ЛЮТАГА 1932 г. МАСКВА, КРЭМЬ.

Савет Працы і Абароны пастанаўляе:

1. Закантрактаваць з ураджаю лёну 1932 году:

а) лёну-даўгунца валакном 202,5 тысяч тон, б) трастой 830 тыс. тон, в) саломай 39 т. т. Усяго ў пераводзе на валакно не менш 375 тыс. тон.

г) насеньня лёну-даўгунца 300 тысяч тон, у тым ліку сартавых 4,7 т. т., д) насеньня лёну-кудраша 120 т. т., у тым ліку сартавых 2,8 т. т.

2. Закантрактаваць з ураджаю канапель 1932 году:

а) валакна 70 тысяч тон, б) трасты 300 тыс. т., в) саломы 80 тыс. т. Разам у перавоцве на валакно 120 тысяч тон.

г) насеньня канапель 110 тыс. тон у т. л. сартавых 4,9 т. т.

3. Кантрактацыю праводзіць на наступных падставах:

а) у раёнах МТС кантрактацыя лёну і канапель у калгасах, абслугоўваемых МТС, а таксама ўраджаю канапель з агрэмаджаных плошчаў, што знаходзяцца ў карыстанні членаў гэтых калгасаў праводзіцца праз МТС. З гэтай мэтай «Загатлён» заключае генеральны дагавор з Трактарацэнтрам. Мясцовыя канторы «Загатлён» заключаюць лёкальныя дагаворы з машынна-трактарнымі станцыямі. У дагаворах машынна-трактарных станцый з калгасамі, а ў адзіночных неагрэмаджаных пасевах канапель—з калгаснікамі, прадугледжваецца пэўная колькасьць працуцьі, належачай здачы кожным калгасам і калгаснікам.

б) У раёнах заводаў першчнай апрацоўкі лёну і канапель «Загатлён» праводзіць кантрактацыю праз гэтыя заводы. З гэтай мэтай «Загатлён» па пагодзе з Галоўлёнкомам і Галоўканопляводам заключае генеральныя дагаворы з рэспубліканскімі краёвымі і абласнымі трэстамі першчнай апрацоўкі, а мясцовыя органы «Загатлёна» заключаюць лёкальныя дагаворы з пасобнымі заводамі першчнай апрацоўкі. Кантрактацыя праводзіцца толькі праз тыя заводы першчнай апрацоўкі, якія ўступаюць у дзеянне да 1 мая 1932 г. Парадак кантрактацыі гэтымі заводамі трасты і саломы, а таксама валакна і насеньня устанаўляе «Загатлён».

в) У іншых раёнах кантрактацыя ў калгасах і аднаасобных бядняцкіх-серадняцкіх гаспадарак праводзіцца мясцовымі органамі «Загатлён» непасрэдна.

г) Кантрактацыя лёну і канапель праводзіцца па спэцыяльных дагаворах пасобна ад дагавораў кантрактацыі іншых культур, але адначасова на валакно, трасту, саломы і насеньне.

д) У кулацка-заможных гаспадарках лён і канопілі не кантрактуюцца, а адводзяцца імі па цьвёрдых заданьнях.

4. Арганізаваць у 1932 г. у лёнакапляводных раёнах ня менш 105 новых МТС да веснавой пасеўнай кампаніі.

5. Уключыць у вытворчасьць поўнасьцю 489 заводаў першчнай апрацоўкі лёну і канапель пабудаваных у 1931 г. і пабудаваць 350 новых заводаў у 1932 г.

6. Завесьці ў 1932 г. у раёны лёнакапляводства 25 тысяч лёнацерабілак, 15.000 вязальных апаратаў да іх, 1.500 лёнаабшчальнікаў, 1.500 лёнатрыераў, 5.000 лёнацёрак, 1.200 сеялак, 4.400 6 і 12 парвальных мялак, 550 прасілак і 2.000 лёнавых прэсаў.

7. Для забесьпячэньня насеньнем пашыраючыхся пасеўных плошчаў лёну і канапель адпусьціць для снабжэньня пасеўшчыкаў, што заключаюць дагаворы аб кантрактацыі, у першую чаргу калгасаў, 130 тысяч тон пасеўнага насеньня з іх 90 тыс. тон насеньня лёну-даўгунца, 10 тыс. тон насеньня лёну-кудраша і 30 тыс. тон насеньня канапель, 50 проц. агульнай колькасьці насеньня адпусьціць у крэдыт да 1 лістапада 1932 г. і 50 проц.—на месны разрахунак. Адпускаць насеньне па загатоўчай цане раёну разь меркаваньня насеньня з накідкай ня больш 15 проц.

8. Адпусьціць для снабжэньня (продажу) здатчыкам лёну і канапель 368 тыс. тон хлеба (з іх 48 тыс. тон у перыяд пасеўнай кампаніі за наяўны разрахунак).

9. Завесьці прамтавары ў лёна-мачо пляводчыя раёны для снабжэньня (продажу) здатчыкаў лёну і канапель на суму ня менш 225 млн. руб. па рэалізацыйных цэнах у адпаведным асортымэнце.

Абавязаць Наркамснаб СССР і Цэнтрасаюз пры ўстанаўленьні тэрмінаў адгрузкі прамтавараў прадугледзіць завоз ня менш 30 проц. у перыяд пасеўнай кампаніі і апрацоўкі пасеваў, а астатняя колькасьць—у перыяд загатовак.

10. Устанавіць выдачу (продаж) расьліннага масла і жмыхаў здатчыкам насеньня лёну і канапелі па наступных нормах:

а) для калгасаў—3,5 кг. масла і 5 кг. жмыхаў супроць аднаго цэнтнера аданага насеньня;

б) для аднаасобных бядняцкіх і серадняцкіх гаспадарак—2,5 кг. масла і 4 кг. жмыхаў супроць аднаго цэнтнэра аданага насеньня;

в) для насеннагадоўчых калгасаў і здатчыкаў сартовага насеньня—5 кг. масла і 7 кг. жмыхаў супроць аднаго цэнтнэра аданага насеньня.

11. Прыняць да ведама, што Дзяржбанкам будзе адпушчана для грашовага авансаваньня кантрактантаў 60 млн. руб., з іх у красавіку—мае—60 проц., на працягу чэрвеня і ліпеня—40 проц. і дадаткова 10 млн. руб. на крэдытаваньне снабжэньня насеньнем з подпускам іх поўнасьцю ў II квартале.

12. Устанавіць наступныя тэрміны здачы (продажу) закантрактаванай прадукцыі:

	IV кв. 1932 г.	I. кв. 1933 г.	II кв. 1933 г.
	(у процэнтах)		
Па лёнавазкну	80	20	—
Па насеньні лёна даўгунца	100 да I|XII	—	—
Па насеньні лёна-кудраша	100 „	—	—
Па ваеньні канапель	100 „	—	—
Па пяньовым валакне	30	30	40
Па лёнаавай саломе і трасьце	100	—	—
Па трасьце канапель	50	—	50
Па саломе канапель	100	—	—

13. Прадставіць у 1932 г. калгасам і аднаасобным бядняцкім і серадняцкім гаспадаркам, засяваючым лён і канопілі, тыя-ж ільготы, што і ў 1931 г., а іменна:

а) Увесь прырост пасеўнай плошчы пад лёнам-даўгунцом і канопліямі ў гаспадарцы супроць 1931 г. вызваляецца ад адзінага с. г. падатку.

б) Усе пасевы лёна-даўгунца і канапель на нанова асвоеных землях, а таксама ўсе пасевы канапель ў полі вызваляюцца ад адзінага с. г. падатку.

в) Даход з кожнага гектара лёну і канапель прыраўноўваецца да паловы даходу з гектара зярнёвых культур у тых жа раёнах.

г) Калгасы і аднаасобныя бядняцкія серадняцкія гаспадаркі, якія засеялі ня менш 10-15 проц. агульнай пасеўнай плошчы лёнам-даўгунцом, ці ня менш 5-7 проц. канопліямі пры абавязковым выкананьні гэтымі гаспадаркамі кантрактацыйных дагавораў, якія вызваляюцца ад узьлічаных норм здачы (продажу) хлеба ўраджаю 1932 г. ва ўсіх раёнах БССР, Паўночнага краю, Ленінградзкай, Заходняй, Маскоўскай і Іванаўскай вобласьцей. Гэта ільгота пашыраецца таксама і на незярнёвыя раёны Ніжагародзкага краю Заходня-Сібірскага і Усходня-Сібірскага краёў, ЦЧО, Башкірскай і Татарскай АССР, Далёка - Усходняга краю, Сярэдня-Волскага краю і УССР Пералік незярнёвых раёнаў у гэтых краёх, вобласьцях і рэспубліках устанаўляецца краявымі і абласнымі выканкомамі і СНК рэспублік не пазней 1 сакавіка 1932 г. Абавязковы процант пасеву лёна (у межах 12—15 проц.) і канапель (у межах 5—7 проц.) да агульнай пасеўнай плошчы (азімай і яравой), якая дае права на атрыманьне паказанай ільготы, вызначаецца для кожнага раёну край (вобл) выканкомамі і СНК рэспублік.

У гаспадарках, карыстаючыхся ільготай, паказанай у гэтым пункце, кантрацыя азімых і яравых зярнёвых культур не праводзіцца.

д) Для раёнаў і гаспадарак, не падпадаючых пад паказаную ў п. «г» ільготу, пры выкананьні ў 1932 г. кантрацыйных дагавораў і самаабязацельстваў па здачы зярнёвых культур дапускаецца замена зярня (апроч сартавога) валакном і насеньнем лёну і канапель. Пры гэтай замене 1 кл. насеньня лёну і канапель прыраўноўваецца да 2 кг зярня, а 1 кг. валакна прыраўніваецца да 8 кг зярня. Валакно, якое прымаецца ў замену зярня, па якасьці пазбіна быць ня ніжэй сярэдняга нумару валакна данага раёну. Замена дапускаецца толькі пасьля выкананьня гаспадаркамі сваіх абавязацельстваў па здачы насеньня і валакна лёну і канапель.

е) Пасевы лёну і канапель падлягаюць дарэмнаму акладному страхаваньню ад засухі.

14. Абавязаць НКЗ СССР забясьпечыць своячасовае і поўнае правядзеньне ўсёй сумы агранамічных мерапрыемстваў у адносінах кантрактуемых пасеваў лёну і канапель

15. Прапанаваць СНК саюзных і аўтаномных рэспублік, краявым і абласным выканкомам забясьпечыць сканчэньне кантрактацыі лёну і канапель не пазней 1 мая 1932 г.

Нам. Старшыні Савету Працы і Абароны В. Куйбышаў.
Сакратар Савету Працы і Абароны І. Міроннікаў.

ПАСТАНОВА САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР

ПРА ПАДАЧУ ГАСПАДАРЧЫМІ АРГАНІЗАЦЫЯМІ ВЕСТАК АБ ЗАПАЗЫЧАНАСЬЦІ ПА ЗАРАБОТНАЙ ПЛАЦЕ.

Адзначаючы наяўнасьць зусім недапушчальных фактаў няправільнага скарыстаньня фондаў заработнай платы і адсутнасьць належнага вучоту запазычанасьці што прыводзіць да неплянавага перавыдаткаваньня фонду заработнай платы і росту запазычанасьці па ёй, СНК БССР пастанаўляе:

1. Абавязаць усе дзяржаўныя, гаспадарчыя і каапэрацыйныя ўстановы і прадпрыемствы, апроч установаў і прадпрыемстваў, падаваць таксама ў Дзяржаўны банк па месцы знаходжаньня сваіх рахункаў даведкі аб становішчы з запазычанасьцю па зарплаце на 1-е число кожнага месяца з паказаньнем часу і тэрміну, за якія стварылася запазычанасьць і прычын яе ўтварэньня.

2. Даведкі аб запазычанасьці падаваць на падставе бухгальтарска-справаздачных даных з падпісам кіраўніка ўстановы і прадпрыемстваў.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР К. БЭНЭК.
Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканомсавету БССР Ф. СУЛКОЎСКІ.
9 лютага 1932 г. № 64.

Па БССР

Першыя вынікі вялікага паходу

Дзень тэхніці ў Гомелі ператварыўся ў масавы паход усіх прадпрыемстваў на барацьбу за аўладаньне тэхнікай, за эканамічную незалежнасьць СССР.

ЗАВОД «ПРАЛЕТАРЫ» ўзяў на сябе абавязак выканаць заказ па вырабу цялежак для вусянічных трактараў. Гэтыя цялежкі раней увозіліся з-за мяжы. Завод выпусьціў каля 2.000 раствора-мяшалак, якія таксама раней увозіліся з-за мяжы. Гэтыя механізмы на заводзе пераканструяваны, што дае значнае зьніжэньне сабекошту.

НА КАНІФОЛЬНЫМ ЗАВОДЗЕ ў Нова-Беліцы, дзякуючы творчай ініцыятыўнасьці рабочых ставіцца пытаньне аб скарачэньні і замене імпартнага абсталяваньня, гэта дасьць магчымасьць заводу павялічыць выпуск прадукцыі з 5.000 да 100.000 куб. мэтраў у год.

ПАД КІРАЎНІЦТВАМ АКАДЭМІКА-ПРАФЭСАРА ШКАЦЕЛАВА ў Навукова-Дасьледчым лесапрамысловым інстытуце вядуцца дасьледы па скарыстаньні адгонных вады каніфольна-шкіпінарнай вытворчасьці з мэтаю атрыманьня з гэтае вады араматычных эсэнцый.

НА ГОМСЕЛЬМАШЫ ВЯДЗЕЦЦА ПАДРЫХТОЎЧАЯ РАБОТА да аслыцьцяўленьня прапановы інжынэра Санатаборскага і тэхніка Левіна па замене дубам імпартнага пнэгэра № 6-5, што дасьць вялікую эканомію заводу.

ПАНЧОШНА - ТРЫКАТАЖНАЯ АРЦЕЛЬ «ГОМТЭКСТЫЛЬ», каб вызваліцца ад увозу імпартных заказаў пераходзіць на трыкатажныя голкі са вецкага вырабу. Мэханік Рэзэнталь ужо месяц працуе на рамантаваных старых голках, якія раней выкідваліся і гэтым самым зьнізіў прастой станкоў.

Электрапайка Дзічкоўскага

На машынабудаўнічым заводзе імя Варашылава ўпяршыню сканструяваны апарат для мядзянай электрапайкі.

НА ЗДЫМКУ: Дзічкоўскі робіць вопыты электрычнай пайкі.

Пайка мядзяных труб дагэтуль была горнавая (шляхам нагрэву, ручная). Ручны спосаб праходзіў вельмі марудна і забіраў многа апалу.

Задаўшыся мэтай паскорыць і палепшыць працэс пайкі, дырэктар заводу тав. Дзічкоўскі прыйшоў да высновы, што можна пайку праводзіць пры дапамозе электрычнасьці. Тав. Дзічкоўскі разам з брыгадай электрамацёраў сканструявалі новы апарат для электрычнай пайкі мядзяных труб.

Вопыт даў добраякасную пайку, но вы апарат паскорвае працэс пайкі, дае эканомію ў рабочай сіле, апале, зьніжае сабекошт. Пры дапамозе гэтага апарату даскягаецца паскораньне працэсу пайкі на 20 хвіл. на 1 трубе. Пры ручным спосабе апалу траціцца на адну пайку на 48 кап. — цяпер на 8 кап. Уручную пайку павінны былі праводзіць 2 рабочых, пры новым апараце—працуе 1 рабочы.

У заводзкім маштабе новы апарат дае эканомію 8.500 рублёў у год. З укараненьнем новага апарату, завод пройдзе на электрапайку многіх дэталяй. Пасьля адобраньня апарату камітэтам па справах вынаходніцтва, ён будзе распаўсюджаны на іншых заводах Саюзу.

ГЭТЫМІ ДНЯМІ СНК БССР у пастанове па пытаньні разьвіцьця савецкага гандлю адзначыў, што органамі Наркамснабу БССР, каапэрацыяй, мясцовымі савецкімі органамі, а таксама калгаснымі і саўгаснымі сыстэмамі нявыкананы пастановы ўраду СССР і пленуму ЦК УсеКП(б) аб разьвіцьці савецкага гандлю. На сёньняшні дзень савецкія базары адкрыты толькі ў Воршы, Менску, Гомелі, Магілеве.

МЭХАНІКІ АКУЛЯРНАЙ ФАБРЫКІ т. т. Легзін і Кісельгоф сканструявалі станок для выпрацоўкі дыскавых пілачак, якія раней увозіліся з Нямеччыны. Гэтыя пілкі будуць таксама скарыстоўвацца і панчошнымі фабрыкамі.

Здымаю з сябе сан папа

Усьвядоміўшы, што рэлігія ня мае нічога рэальнага, а ўсё ў ёй абгрунтавана на меркаваньнях і ёсьць дурман, і знаходзячы, што яна зьяўляецца тормазам сацыялістычнага будаўніцтва, я ад гэтага часу здымаю з сябе сан папа і парываю ўсякую сувязь з рэлігіяй, царквою і не служкамі і заклікаю ўсіх маіх былых сяброў пасьледваць майму прыкладу.

Служка культу з 1917 году, сьвяшчэньнік Ляднянскага прыходу, Дубровенскага р-ну Рыгор Ліцічкін

Памножыць прыклады трох ударных

КРУПКА. Калгасы «Перамога», «Барацьбіт» Грыцькаўскага сельсавету, «Высокае», «Кастрычнік», Хальнявіцкага сельсавету паказваюць узорны прыклад падрыхтоўкі да трэцяй бальшавіцкай вясны. На 10 лютага гэтыя калгасы поўнасьцю падрыхтаваліся да выезду ў поле. Вытворчыя пляны складзены, абгаворваны на сходзе і даведзены да кожнага калгасьніка. Насеньні, страхавыя і фуражныя фонды створаны, інвэнтар і збруя адрамантаваны. Людзі разьмеркаваны на брыгады, якім вызначаны цьвёрдыя пляны работы ў часе слёбы. Уся работа па падрыхтоўцы да слёбы праводзіцца на аснове сацыяборнічтва і ўдарніцтва.

Іншыя калгасы Крупчыны павінны ўзяць прыклад з перадавых у падрыхтоўцы да слёбы.

Д. Р.

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

ПА ДАКЛАДУ НАРОДНАГА КАМІСАРЫЯТУ ЗЕМЛЯБСТВА АБ ВЫНІКАХ РАБОТЫ ПА РАЗЬВІЦЬЦІ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ Ў 1931 г.

Адзначаючы невыкананьне раду важнейшых арганізацыйна - гаспадарчых задач па жывёлагадоўлі, прадугледжаных плянам 1931 г., Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Абавязаць Народны Камісарыят Земляробства, Белкалгасцэнтр, Белкаапсаюз, дырэктараў сельскагаспадарчых трэстаў; раённыя выканаўчыя камітэты і гарадзкія саветы:

а) камплектаваньне калгасных таварных фэрм, прадугледжанае плянам 1931 г., і распачатае будаўніцтва скотных двароў, сьвінарнікаў, птушнікаў і трусятнікаў поўнасьцю закончыць да 1-га красавіка;

б) давесьці да 25 лютага ўсе вытворчыя заданьні па жывёлагадоўлі на 1932 г. да сельсаветаў, саўгасаў, калгасаў, паасобных вёсак і двароў і забясьпечыць поўнае іх выкананьне;

в) вылучыць да 1 сакавіка ўсе вызначаныя плянам 1932 г. таварныя калгасныя фэрмы і зараз-жа пачаць іх камплектаваньне, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на неабходнасьць камплектаваньня за лік ўнутраных рэсурсаў самых калгасаў.

2. Абавязаць НК Земляробства, Белкалгасцэнтр і Белкаапсаюз неадкладна распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы для падвышэньня якасьці здаваемай мяса-малочнай прадукцыі і забясьпечыць поўнае і своячасовае выкананьне саўгасамі і таварнымі фэрмамі плянаў здачы таварнай прадукцыі, а таксама больш шырока разгарнуць работу па арганізацыі калектыўнага адкорму ў неспецыялізаваных калгасах і сельскіх спажывецкіх таварыствах.

3. Для ўзмацненьня пралетарскага кіраўніцтва і грамадзкага кантролю над паасобнымі гаспадаркамі, асабліва таварнымі фэрмамі, прапанаваць НК Земляробства, Белкалгасцэнтру, Белкаапсаюзу і НК Снабжэньня на працягу 2-х дэкад распрацаваць пляны прымацаваньня гаспадарак да паасобных фабрык і заводаў для забясьпечаньня іх малочнымі і мяснымі прадуктамі ў лік цэнтралізаванага снабжэньня. Прымацаваньне скончыць у месячны тэрмін.

4. Улічваючы незабясьпечанасьць гаспадарак моцнымі кармамі, а паасобных гаспадарак нават і грубымі кармамі (асабліва прыгарадных гаспадарак спажывецкай каапэрацыі), даручыць НК Земляробства зараз-жа падняць пытаньне перад НК Земляробства і НК Снабжэньня СССР аб павялічэньні завозу моцных кармоў у БССР, правесьці ўнутранае перараз-меркаваньне і перакідку прубых кармоў па сыстэмах. Побач з гэтым абавязаць НК Земляробства, РВК і гарсаветы зараз-жа разгарнуць работу па загатоўцы і скарыстаньні корму з гальля.

5. Для захаваньня маладняка, абавязаць НК Земляробства і Малакомгасцэнтр укамплектаваць да 1 красавіка ўсе цялячыя фэрмы, вызначаныя плянам 1931 і 1932 г., і неадкладна распрацаваць і ажыцьцявіць рад мерапрыемстваў, накіраваных супроць дарэжнічкага забою маладняка ацёлу бугучага году.

6. Бяручы пад увагу неадавальняючую пастаноўку сучоту пагалоўя жывёлы і работу па жывёлагадоўлі, абавязаць НК Земляробства, Белкалгасцэнтр, сельскагаспадарчыя трэсты і РВК у месячны тэрмін устанавіць дасканалы вучот і апэрацыйную справу здачнасьць усёй работы па жывёлагадоўлі, а таксама і сталы вучот усяго пагалоўя жывёлы.

7. Для пасьпяховага праведзеньня злучнай кампаніі ў 1932 г. абавязаць НК Земляробства зараз-жа праверыць разгортваньне на мясцох сеткі злучных пунктаў, забясьпечаньне іх вытворнікамі, а таксама падрыхтоўку да штучнага абсямяненьня.

У зьвязку з недахватам у сьвінагадоўчых калгасных фэрмах кнуроў-вытворнікаў, абавязаць Бел. К-ру Трэсту «Сьвінавод» на працягу 2-х месяцаў перадаць калгасным фэрмам 2.000 вытворнікаў, побач з гэтым праводзіць практыку замены калгасамі з трэстам «Сьвінавод» сьвіноматак на вытворнікаў.

8. Бяручы пад увагу, што безгаспадарчае становішча ў радзе гаспадарак выклікала масавае захворваньне і падзеж маладняку ад сухотаў і белагі паносу, абавязаць НК Земляробства (т. Сакалова), Бел. К-ру Трэсту «Сьвінавод» (т. Абчыньнікава) і Сьвінавод калгасцэнтр (т. Красоўскага) павесьці рашучую барацьбу з безгаспадарчасьцю, прыцягваючы дырэктароў саўгасаў, кіраўнікоў фэрм і вэтэрынарсанал гаспадарак да крымінальнай адказнасьці з спагнаньнем страт, якія мела гаспадарка.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР
М. Галадзед.
Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР
С. Кандыбовіч.
15 лютага, 1932 г.
г. Менск. № 71.

АПАВЯШЧЭНЬНІ

Партклегія ЦКК КП(б)Б просіць зьявіцца ў ПК, альбо паведаміць свой адрас ці месца працы наступных т.т.:

Дзесюкевіча Міколу Янкава (б. Вузьдзенская арг.), Савоячыка Ігната Аляксеева (б. Чэрвенскай арг.), Ульмана А. Х., (б. Смалявіцкай арг.), Бутько Івана Паўлава (б. Халопеніцкага раёну), Кевіча Івана Іванава (прыгародны саўг. «Чырвоны Каапэратар»), Высоцкага Пётра Пятрова (б. Бягомльскі раён). Готліб Міхаіся Ісакава (б. Грэскі раён), Клімкова Алеся Янкава (б. Кругляноскі раён).

Просьба да ўсіх арганізацый, ведаючых месца знаходжаньня памянёных т. п., паведаміць у ПК ЦКК КП(б)Б.

Сакратар ПК ЦКК КП(б)Б **Суханава.**

Партклегія ЦКК КП(б)Б просіць зьявіцца ў П. К., або паведаміць свой адрас і месца працы т.т. **Кагана Ш. Г.**, (б. працаўнік Шклоўскага Райсаюзу), Хадалеева Міколу Цімохава (Петрыкаўскай арг.).

Просьба да ўсіх арганізацый, ведаючых месца знаходжаньня памянёных т.т.—паведаміць у ПК ЦКК КП(б)Б.

Член Парткалегіі ЦКК КП(б)Б **Біге.**

18 і 19 лютага г.г. увечары а 7-й гадзіне адбудзецца нарада ў Бюро Скаргаў ЦКК-НКРСІ Беларусі (першы паверх—Савецкая, 55) лёгкіх кавалерыстых г. Менску, рабочых засядацеляў, грамадзкіх інспэктароў, шэфбрыгадзіраў, сац. намесьнікаў, рабкораў усіх цэнтральных газэт.

Павінны зьявіцца на нараду толькі тыя з таварышоў, якія будуць працаваць 19 і 20 у другую зьмену, а днём 19 і 20 свабодны.

Інспэктар Бюро Скаргаў ЦКК—НКРСІ Бел. **КУЧАРАЎ.**

Партклегія ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 23-II — 32 г. у м. Сянно будзе працаваць выязная ПТ ЦКК КП(б)Б па разглядзе наступных апэляцыйных спраў:

1. Кандрацьева Янкі Аляксеева (м. Сянно).
2. Івашуціна Язэпа Васіл. (м. Сянно).
3. Фрыдмана Якуба Маркава (м. Сянно).
4. Альшанскава П. І. (м. Сянно).
5. Малюкову Лісавету Ігнат. (м. Сянно).
6. Маханькова Яўхіма Захар. (м. Сянно).
7. Александровіча Нічыпара В. (м. Сянно).
8. Літвінава Міхася Ісакава (м. Сянно).
9. Маньтава Трахіма Рыгор. (м. Сянно).
10. Багданава Янку Александр. (м. Сянно).
11. Васюціна Хведара Барыс. (м. Сянно).
12. Гараўца Міколу Янкава (м. Сянно).
13. Баляжова Сяргея Ахрэмава (м. Сянно).
14. Рудэра Міхася Барыс. (м. Сянно).
15. Блошкава Івана Антонава (м. Сянно).

Вышэйпамянёныя таварышы павінны абавязкова зьявіцца на ПК ЦКК КП(б)Б.

Праезд за свой кошт.

Член ПК ЦКК КП(б)Б **Блоштэйн.**

Нам. адказнага рэдактара
Г. АДАМСОН.

Гукавы кіно-тэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“ Каса з 1 г дня — Толькі 2 дн 17 і 18 У АПОШНЯЙ ЧАРТЫ

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ“ Каса ад 12 гадз — ШПАРКАСЬЦЬ І НАЦІСК У галоўнай ролі Гарольд-Лёйд

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ“ — З камэдыі ў адзін сэанс Лі ў раю, Чарлі ў тэатры і Ласо

БЕЛАРУСКАЕ КІРАЎНІЦТВА СУВЯЗІ
даводзіць да ведама ўсіх установаў і прыватных асоб, што на падставе распараджэньня Наркамсувязі
з 15 лютага пасылкі будуць перасылацца (е) бланкаў саправаздзіцельных адрасоў;
АДПРАВЦЭЛІ ПАСЫЛАК
павінны пісаць яскрава адрасы на пасылках
Каштоўныя пасылкі ад 50 руб. апячатваюцца; на квітках у прыёме пасылак, заказных лістоў, грашовых пераводаў указваюцца каму адрасована.
На каштоўных пасылках ад 50 р. і на пасылках з наклаўной платай—абавязкова абазначаецца на менаваньне і адрас адправ целя.

Да ведама трохкутнікаў і культармейцаў
19 лютага, а 7 гадз. увечары ў памяшканьні Дома Асьветы (Камуністычная 19)
адбудзецца зьлёт трохкутнікаў
разам з культармейцамі па пытаньню выкананьня пастановы ЦК партыі аб школе і папярэднія вынікі культэстафэты
Дакład Гарана, інфармацыі трохкутнікаў: „Камунарка“, „Бальшавік“, „Акцябр“ і „Камунар“ ФЗС №№ 1, 18 5, 2. 33, і брыгады праверавушых гэтыя школы і прадпрыемствы.
2. Прэміраваньне лепшых ударнікаў культармейцаў. 3. Мастацкая частка.
ГК КП(б)Б, Гаспрафсавет, Гарана

Даводзіцца да ўсіх дзяржаўных каапэрацыйных і гаспадарчых арганізацый,
ШТО ПРЫСТАНЬНЮ ГОМЕЛЬ ПРЫМАЮЦЦА ЗАЯЎКІ
НА ПЕРАВОЗКУ ГРУЗАЎ па рацэ Сож
у навігацыю 1932 г. па наступнай форме:
Ад якой і да якой прыстані трэба перавезьці груз, у якім месяцы, назва грузу і ў якой колькасьці.
Заяўкі павінны быць прадастаўлены не пазьней як да 20-II г.г.
Арганізацыі не прадставіўшыя да паказанага гэтэ мінуе заяўкі па будуць уключаны ў пляны перавозак у навігацыю 1932 г.

ГЭТЫМ АБВЯШЧАЕЦЦА,
што з 10 лютага 1932 г. Стрэшынскае, Салтанаўскае і Чырвона-Бярэзскае першапачатковыя вытворчыя таварыствы Жлобінскага раёну
ЛІКВІДУЮЦЦА
Усе прэтэнзіі да паказаных таварыстваў павінны быць накіраваны у ліквідацыйныя камісіі гэтых т-ваў, якія працуюць да 1 сакавіка г.г., пасьля якога тэрміну ніякія прэтэнзіі ўстаноў, арганізацый і прыватных асоб да паказаных таварыстваў ПРЫМАЦЦА НЯ БУДУЦЬ
Райкаапсаюз

НАБОР на кірэйскае і польскае аддзяленьні Менскіх 6-цімесячных пэдагагічных курсаў
ПРАЦЯГНУТ да 20 лютага г. г.
Прымаюцца асобы, узростам ня менш 17 год, скончыўшыя сямігодку
Маючыя адукацыю ніжэй сямігодкі пры паступленьні трымаюць іспыты
Усе курсанты забясьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам
Дакументы накіроўваць па адрасу—Менск, Гарана, пэдагагічныя курсы
ПАЧАТАК ЗАНЯТКАЎ 21-II г. г.
Сэкратар Гарсавету (подпіс). Заг. Гарана (подпіс)

УСІМ ТРЫМАЦЕЛЯМ ДЗЯРЖПАЗЫК
ПАВЕДАМЛЯЕЦЦА
што ў зьвязку з перадачай аперацый з дзяржпазыкамі ў сыстэму ашчадкас,
Менскае Аддзяленьне Дзяржбанку
З 17-II 1932 году СПЫНЯЕ АПЭРАЦЫІ
па прыёму і выдачы ўкладаў захаваньня, пазычак пад аблігацыі і г. д.
Далейшае вытварэньне гэтых апэрацый будзе адноўлена з 1-III 1932 г.
сэктарам дзяржпазык пры Гарашчадкасе № 16 (рог Камсамольскай і Савецкай вул.)
Кіраўнік Менадзяленьня Дзяржбанку КЕЙЛІН
Кіраўнік Гарашчадкасы № 16 ЖАЛЕЗНЫ

УВАРАВІЦКІЯ
3½-МЕСЯЧНЫЯ ТРАКТАРНЫЯ КУРСЫ
ПРЫ АЎТА-ТРАКТАРНЫМ ТЭХНІКУМЕ
АБВЯШЧАЮЦЬ ЛЮТАЎСКІ ПРЫЁМ НА КУРСЫ ТРАКТАРЫСТАЎ
На курсы прымаюцца ў першую чаргу рабочыя саўгасаў, батракі, калгасьнікі, сяляне беднякі і серадняк.
Курсанты забясьпечваюцца кватэрамі і стыпэндыяй па 25 рублёў у месяц.
УМОВЫ ПРЫЁМУ: паступаючыя павінны быць ва ўзросьце 18—40 год, фізычна здаровыя, пісьменныя ў аб'ёме 4-хгод. і 1 пасьля курсаў павінны працаваць у саўгасах Белмашрамтрэсту на працягу 2-х год.
Да заяў павінны быць прыкладзены наступныя дакументы: 1) аб узросьце; 2) аб асьвеце; 3) аб стане здароўя і на 30 кап. паштовых марак для дказу. Апрача таго рабочыя саўгасаў і калгаснікі дылучаюць камандыроўкі саўгасаў або калгасу, а сяляне—копію ліста сельска-гаспадарчага падатку на 1931-1932 г. і спраўку аб выбарчых правах.
Прыём заяў да 20-га лютага 1932 году
ПАЧАТАК ЗАНЯТКАЎ 28-га лютага
Заявы накіроўваць па адрасу: ст. Уза, Зах. чыг. п-а Уваравічы, Кантора Трактарных Курсаў.
Загадчык Трактарных Курсаў ЦЯРЭЦКА

Рэдакцыі газэты „Савецкая Беларусь“ —) ПАТРАБУЮЦЦА (— на дзённую і вячэрнюю работу
МАШЫНІСТКІ,
якія добра ведаюць беларускую мову
Зварочвацца ад 12 да 19 гадз., Менск, Пляц Волі, 17, першы паверх.

НАВУКОВЫЯ ПРАЦЎНІКІ
18 II а 7 гадзіне ўвечары
АПОШНІ ТЭРМІН
выдачы наборных картак у клюбе навуковых працаўнікоў
СНПР

ЗГУБЛЕНЫ:

Камсамольскі білет, Хасіна Я. Х., выд. Мсьціслаўскім РК ЛКСМБ. Квіт. 1379-п.

Вайсковая кніжка Велешка Я. Ю., выд. Капыльскім ваенкаматам. Квіт. 1380-п.

Вайсковы білет Бурмы С., выд. Капыльскім ваенкаматам. Кв. 1381-п.

Каапэрацыйная паявая кніжка Шайра М. М., выд. Капаткевіцкім сельпо. Квіт. 1382-п.

Пасьведчаньне асобы Госмана Д. Д., выд. 2 аддз. Ленінградзкай міліцыі ад 27-IX 1928 г. за № 84. Камсамольскі білет, выд. Марксштадзкім кантонным камітэтам камсамолу. Членскі білет саюзу працасьветы, выд. Профкомам пры немпэдтэхнікуме ў Ленінградзе. Квіт. 1384-п.

Квіт Маскальцова К., выд. Чэрыкаўскім леспрамгасам № 12028 на 90 р. Квіт. 1385-п.

Пасьведчаньне на права скасаваньня шлюбу Філіпенка А., выд. Хадосаўскім сельсаветам. Кв. 1386-п.

Прафсаюзная кніжка Аўраменка К., выд. Марыўпольскім заводакіраўніцтвам прафсаюзная кніжка. Кв. 1387-п.

Камсамольскі білет № 104610 Матор нага І. Р., Квіт. 1389-п.

Асабовы дакумант і білет паляўнічага гурткa Міцура С. І., Кв. 1389-п.

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА: Менск, Пляц Волі, 17. Тэлефоны: Адказны рэдактар—7-69, адказны сакратар 4-78, сэктары 6-15, выпускаючы—12 55 (два званкі), выдавецтва—2-44.
Умовы падпіскі: на 1 год—12 р., 6 месяцаў—6 руб., 3 м-цы—3 руб., 1 месяц—1 руб. Падпіска прымаецца выключна на пошце

Упаўнаваж. Галоўлітбел. № А—53 — Друкарня імя Сталіна.